

У ДЗЯДОЎ ЗУБЫ НЕ БАЛЕЛІ. А Ў НАС? **5**



СТРАЧАНАЕ, ЯКОЕ... НЕ СТРАЧАНА **8**


Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

17 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. СЕРАДА

№ 116 (29230)


З першых вуснаў

# «ГАЛОЎНАЕ — ЗАХАВАЦЬ СВАЮ ЗЯМЛЮ ДЛЯ СЯБЕ І ДЛЯ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ»

## У Гродне Прэзідэнт расставіў прыярытэты дзяржаўнай палітыкі на бліжэйшую перспектыву

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка здзейсніў рабочую паездку ў Гродна, падчас якой сустрэўся з актывам вобласці і наведаў «Гродна Азот».**

**«У нас не перадвыбарчая нарада, сустрэча, сход, — сказаў ён у сваім выступленні ў гарвыканкаме. — Проста сітуацыя ў краіне складаецца такім чынам, што яна мае патрэбу ў канкрэтным растлумачэнні, тлумачэнні перш за ўсё для актыву краіны».**

**Раней аналагічная сустрэча адбылася ў Магілёве. Сутнасць учарашняй — «інфармацыя пра тое, што адбываецца ў нашай краіне, і адказы на самыя, можа быць, і непрыемныя пытанні, якія сёння існуюць».**



Фота БелТА.

### «БАГАЦЦЕ НЕ ПРЫХОДЗІЦЬ ЗНЯНАЦКУ»

Наконт Гродна Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што тут даволі зручнае месца для жыцця. Парадак і чысціню ствараюць самі людзі, якія шчыра любяць свой край. Гэта можна назваць візітоўкай Гродзеншчыны і яе жыхароў. Разам з тым зразумела, што дабрабыту і дастатку можна дабіцца толькі сумленнай працай, і багацце не прыходзіць знянацку. У адваротным выпадку такое багацце не прынясе карысці ні чалавеку, ні дзяржаве.

Працягваючы тэму развіцця рэгіёна, Прэзідэнт падкрэсліў, што Гродзеншчына была і застаецца на лідзіруючых пазіцыях. «Асаблівы гонар рэгіёна — сельская гаспадарка, — зазначыў кіраўнік дзяржавы. — Вобласць трывала займае першае месца ў краіне па тэмпах вытворчасці сельгаспрадукцыі, ураджайнасці збожжавых. Не падводзіць і прамысловасць — тут, нягледзячы на складаную сітуацыю з каранавірусам, удалося захаваць леташнія аб'ёмы».

Аднак такая сітуацыя была не заўсёды. «Быў час, калі палова гродзенцаў ездзіла з баўламі ў Польшчу, а другая палова атрымлівала жабрацкую зарплату на паўразваленых прадпрыемствах. ***Але, на шчасце, мы тады прынялі неабходныя меры і сёння можам ганарыцца дасягненнямі Гродзеншчыны»,*** — заўважыў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што за 25 гадоў аб'ём прамысловай вытворчасці вырас у чатыры разы, экспарт тавараў — амаль у пяць разоў. За дзве апошнія пяцігодкі сярэдняя зарплата па вобласці павялічылася амаль удвая. У вобласці забяспечанасць жыллём адна з самых высокіх у краіне.

«З 1995 года каля 115 тысяч сем'яў (у тым ліку 10 тысяч шматдзетных) палепшылі сваё жыллёвыя ўмовы», — падкрэсліў Прэзідэнт.

### «ТРЭБА БУДАВАЦЬ ТОЕ, ШТО БУДЗЕ ПРЫНОСІЦЬ ПРЫБЫТАК»

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, за час незалежнасці ў рэгіёне рэалізаваны буйныя інвестыцыйныя праекты. У тым ліку ў сферы вытворчасці мінеральных угнаенняў, хімічнай, харчовай прамысловасці, дрэваапрацоўкі. Разам з тым па вобласці не ўсе прэзідэнцкія даручэнні выкананы. Прэзідэнт перакананы — трэба вызначыцца з асноўнымі аб'ектамі, якія будуць узводзіцца ў будучай пяцігодцы.

У краіне будуць удзяляць увагу развіццю значных рэгіянальных праектаў, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. «У іх ліку інтэрнаты для студэнтаў, бальніца пад анкалагічны цэнтр, якая будуецца сумесна з Кувейтам, дарожныя развязкі, каб ніхто не заязджаў транзітам у Гродна, а рухаліся вакол горада. У найбліжэйшы час мы гэтыя праекты рэалізуем», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка дадаў, што кіраўніцтва краіны заўсёды ідзе насустрач просьбам рэгіёнаў, калі трэба дзесьці дапамагчы, дадаць рэсурсаў, таму што ведае: ***«кожны ўкладзены рубель трапіць на добрую глебу».***

***«Развіццё сеткі дарог, інфраструктурных праектаў, у тым ліку ў сацыяльнай сферы, падтрымка рэстаўрацыі і аднаўлення знакавых у сусветным маштабе культурных аб'ектаў*** — пра ўсё гэта вы добра ведаеце», — абазначыў прыярытэты Прэзідэнт.

Ён лічыць, што важна звярнуць увагу на энергетычныя праекты, будаваць новую вытворчасць менавіта на мясцовых відах паліва, асабліва ў невялікіх раёнах вобласці. Для Гродзенскай вобласці гэты кірунак важны ў Воранаўскім, Зэльвенскім, Свіслацкім раёнах.

***«Трэба будаваць тое, што будзе прыносіць прыбытак. І з гэтага трэба зыходзіць. Тое, што ідзе ў тым ліку на экспарт.*** Менавіта на гэта трэба зрабіць акцэнт».

Падчас нарады Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра важнасць будаўніцтва новага азотнага комплексу. Ён паведаміў, што ў Гродне павінна быць прынята канчатковае рашэнне аб месцы для яго будаўніцтва.

### САМЫ МАШТАБНЫ ПРАЕКТ

Па словах Прэзідэнта, у хуткім часе пачне працаваць атамная станцыя ў Астраўцы — самы маштабны праект у гісторыі краіны. «Яго значэнне для забеспячэння энергетычнай бяспекі, ды і ў цэлым эканомікі нашай краіны, проста каласальнае», — сказаў Лукашэнка.

Разам з тым запуск БелАЭС патрабуе свежых і перспектыўных рашэнняў па выкарыстанні лішкаў энергіі. І гэта будзе агульным пытаннем Гродзенскага аблвыканкама і ўрада, адзначыў Прэзідэнт.

Прымаючы рашэнне аб будаўніцтве атамнай станцыі, беларускі лідар зыходзіў з таго, што «гэта вельмі высокія тэхналогіі», «прарыў у будучыню».

***«Калі Беларусь хоча валодаць высокімі тэхналогіямі, мець экалагічны электрычны транспарт, варта ісці гэтым шляхам»,*** — упэўнены лідар краіны.

СТАР. 2

Дарогамі Славы

75 Вялікая Перамога

# Важней за ўзнагароды

**«Звязда» працягвае праект «Дарогамі Славы», які запусціла сумесна з Музеем гісторыі Узброеных Сіл. У межах праекта мы апавядаем пра ваенны шлях поўных кавалераў ордэна Славы, якія нарадзіліся ў Беларусі або звязалі з ёй свой далейшы лёс.**

**Заклікаем вас, паважаныя чытачы: калі сярод вашых родных і блізкіх хтосьці або быў поўным кавалерам ордэна Славы, або асабіста іх ведаў і захаваў успаміны ці фотаздымкі, то дзяліцеся вашымі гісторыямі з намі! Наш адрас — вуліца Б. Хмяльніцкага, 10а, Мінск, 220013. Адрас электроннай пошты — info@zviazda.by. Ніводны ліст не застанецца без увагі!**

**Сёння мы згадваем жыццёвы і ваенны шлях двух салдат. Яны родам з Беларусі, але так склалася, што гналі немцаў з тэрыторый іншых рэспублік — Расіі, Украіны, а таксама Аўстрыі і краін Усходняй Еўропы.**



Пачатак вайны для герояў праекта «Дарогамі Славы» складваўся па-рознаму: камусьці ішоў усяго пятнаццаты год і, каб ваяваць, трэба было яшчэ трохі падрасці, хтосьці заканчваў сямігодку альбо сярэднюю школьную ўстанову, будаваў планы паступаць у інстытут, тэхнікум, на ФЗН. Старэйшыя па ўзросце хлопцы, паспеўшы стварыць сем'і, будавалі хаты, працавалі на заводах, у калгасах, на шахтах, на чыгунцы. Нехта нёс службу ў Чырвонай Арміі, прайшоўшы савецка-фінскую вайну, нехта толькі што надзеў ваенную форму, асвойваў азы ваеннай спецыяльнасці...

СТАР. 6

# Адказныя за выхаванне



Віялета МІХАЛЕВІЧ *(на фота злева)* і Настасся ТРЫСЦЯНЕЦКАЯ яшчэ ўчора вучыліся ў восьмым класе. А ў час летніх школьных канікул сяброўкі даглядаюць сваіх малодшых — пляменніка Святаслава і брацікa Глеба.
*Пасёлак Зялёны Бор, Смалявіцкі раён.*

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

Мы — разам

# «НЕ АТАЧАЙЦЕ СЯБЕ НЕГАТЫВАМ!»

## Валанцёры «Добрага тэлефона» расказваюць, з чым да іх звяртаюцца

**Як перажываюць эпідэмію простыя беларусы? Што іх цяпер больш за ўсё турбуе, як яны спраўляюцца са сваімі трывогамі і страхамі? Псіхолагі кажуць, што добры спосаб пераадолення боязі — расказаць пра яе. Пасля размовы з добразычлівым суразмоўцам нашы страхі памяншаюцца і адступаюць, прыходзіць лепшае разуменне сітуацыі і таго, як у ёй дзейнічаць.**

**Мы ўжо пісалі, што ў Беларусі ў красавіку пачаў працаваць «Добры тэлефон». Спецыяльную тэлефонную інфалінію запусціла Беларускае Таварыства Чырвонага Крыжа (БТЧК), каб дапамагчы адзінокім пажылым людзям, якім з-за каранавіруса рэкамендуюць заставацца дома, не адчуваць сябе адзінокімі. Сёння валанцёры, якія дзяжураць на інфалініі, расказалі нам, хто і з якой нагоды ім тэлефануе.**

СТАР. 3

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Паўночная і Паўднёвая Карэі прывялі войскі ў боегатоўнасць



Паўночная Карэя ўзарвала аб'яднаны штаб сувязі па ўзаемадзеянні з Паўднёвай Карэяй, які размяшчаўся ў ваколіцах прыгранічнага горада Кэсон, паведаміла Бі-бі-сі. За некалькі гадзін да гэтага ўлады КНДР аднавілі пагрозы разгарнуць ваенныя дзеянні супраць свайго паўднёвага суседа. Пхеньян вывучае план дзеянняў, згодна з якім у рэгіён вернуць вайсковыя падраздзяленні. Паведамлялася, што гэта будзе зроблена, каб «ператварыць лінію фронту ў крэпасць» і ўзмацніць пільнасць у дачыненні да Паўднёвай Карэі. У Сеуле ў адказ заявілі, што паўднёвакарэйскія войскі прыведзеныя ў стан павышанай гатоўнасці. У міністэрстве абароны краіны падкрэслілі, што сур'ёзна ставяцца да сітуацыі і ў каардынацыі з ЗША ўважліва сочаць за яе развіццём. Акрамя таго, непасрэдна пасля падрыву вузла сувязі Паўднёвая Карэя склікала экстранную нараду высокапастаўленых супрацоўнікаў службы бяспекі.

### Эксперты спрагназавалі V-падобнае аднаўленне сусветнай эканомікі

Сусветная эканоміка ўступіла ў новы цыкл росту, і ВУП вернецца да дакрызісных значэнняў да чацвёртага квартала, лічаць эканамісты Morgan Stanley. «Мы яшчэ больш упэўненыя ў нашым прагнозе V-падобнага аднаўлення з улікам нядаўніх нечакана пазітыўных звестак аб росце і мер, што прымаюцца», — заўважылі эксперты. Цяпер яны чакаюць «рэзкую, але кароткатэрміновую» рэцэсію. Паводле ацэнкі экспертаў Morgan Stanley, сусветны ВУП дасягне дна ў другім квартале, зваліўшыся на 8,6 % у гадавым выражэнні, і вырасце на 3 % да першага квартала 2021-га. Рызыкамі для прагнозу з'яўляюцца ў тым ліку далейшае развіццё сітуацыі з каранавірусам і перыяд з'яўлення вакцыны. «Згодна з нашым базавым сцэнарыем, другая хваля заражэнняў адбудзецца бліжэй да восені, але яе можна будзе кантраляваць і яна прывядзе да выбарачных лакдаўнаў. У сваю чаргу, песімістычны сцэнарый прадугледжвае, што мы вернемся да жорсткіх абмежавальных мер, уведзеных раней у гэтым годзе, што прывядзе да другой хвалі крызісу», — адзначаюць эксперты.




### На МКС упершыню стварылі пяты стан рэчыва

Амерыканскія навукоўцы з Каліфарнійскага тэхналагічнага інстытута ў Пасадэне распрацавалі ўстаноўку, з дапамогай якой на борце Міжнароднай касмічнай станцыі атрымалі кандэнсат Базэ—Эйнштэйна (КБЭ) — экзатычную квантавую форму матэрыі, пяты стан рэчыва. Для гэтага яны праводзілі эксперыменты з воблакам атамаў рубідыю, астуджаных амаль да абсалютнага нуля. КБЭ падобны на газ і вадкасць — такое воблака часціц паводзіць сябе як адзін гіганцкі атам, падпарадкоўваючыся законам квантавай фізікі. У 1995 годзе першы кандэнсат атрымалі ў лабараторыі. Аднак вывучэнню ўласцівасцяў гэтага стану рэчыва на Зямлі перашкаджае гравітацыя. Каб пераадолець абмежаванні, на МКС стварылі лабараторыю халоднага атама. У будучыні навукоўцы спадзяюцца выкарыстоўваць КБЭ для таго, каб больш дакладна фіксаваць гравітацыйныя хвалі, вывучаць цёмную энергію і ўдасканальваць сістэмы навігацыі касмічных караблёў.

ISSN 1990 - 763X

### КОРАТКА

- **У Беларусі і за мяжой створана 5767 участкаў для галасавання на выбарах Прэзідэнта.**
- Віцяблянка двойчы перамагла ў конкурсе дызайну ў Японіі.
- **Педработнікі будуць атрымліваць да водпуску прыбаўку на аздараўленне.**
- ВУП Беларусі ў студзені—маі знізіўся на 1,8 %.
- **Баранавіцкі камбінат ЖБК наладзіў выпуск пліт для хуткаўзводных зборных пакрыццяў.**
- Пры цяперашніх тэмпах пацяплення праз 30 гадоў у Беларусі будуць прынцыпова новыя аграметэаўмовы.




# ПЯРУН РАЗБУШАВАЎСЯ

## ЯК ЗАСЦЕРАГЧЫСЯ АД НАВАЛЬНІЦЫ?



На мінулым тыдні надвор'е ў Беларусі разгортвалася чатыры дні запар па адным і тым жа сцэнарыі. Днём спякотнае чэрвеньскае сонца распальвала паветра да трыццаці, а часам і нават больш градусаў. Але апоўдня метэарадар з радыусам дзеяння 200 кіламетраў, усталяваны ў Нацыянальным аэрапорце Мінск, пачынаў паказваць на поўдні краіны спачатку сінія, а пасля і чырвоныя плямы, якія азначалі, што туды прыходзяць навальнічныя дажджы. Такіх плям станавілася ўсё больш і больш, яны разрасталіся, пачыналі рухацца з Гомельшчыны і Брэстчыны на поўнач, і, такім чынам, маланкі бліскалі на большай частцы тэрыторыі Беларусі.

За няпоўны тыдзень навальніца ўжо двойчы трапіла ў зводкі здарэнняў, ад якіх пацярпелі людзі. Удзень у мінулую сераду на тэрыторыі садовага таварыства ў Мёрскім раёне быў знойдзены 82-гадовы мужчына без прыкмет жыцця. Следча-аператыўная група высветліла, што пенсіянер вёў у руках ровар паблізу ўласнага прысядзібнага ўчастка, калі ў яго раптам ударыла маланка. Сляды ад электрычнага разраду засталіся на адзенні і целе...

А вось 27-гадоваму рыбаку ў Баранавічах пашанцавала болей. Увечары ў мінулы аўторак ён адправіўся з сябрам на мясцовы вадаём. Ужо грымеў гром і бліскала маланка, калі сябру нехта патэлефанаваў. І тут — нібы правал. Калі ачомаўся, то ўбачыў хлопца ў вадзе за бортам — туды яго выкінуў удар маланкі. На шчасце, небараку ўдалося ўсцягнуць назад на борт і пасля перадаць медыкам.

СТАР. 3


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе

Мы абяцаем нясумнае лета з любімай газетай

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «ГАЛОЎНАЕ — ЗАХАВАЦЬ СВАЮ ЗЯМЛЮ ДЛЯ СЯБЕ І ДЛЯ НАШЫХ ДЗЯЦЕЙ»



Фота БелТА.

## «МЫ АД «БЯЗВІЗУ» АТРЫМАЛІ НАРМАЛЬНЫЯ ГРОШЫ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на развіццё бязвізавай тэрыторыі «Брэст — Гродна». Ён згодны, што вобласць атрымала магутны імпульс з увядзеннем бязвізавага рэжыму. За перыяд дзеяння рэгіён наведала каля 300 тысяч турыстаў без уліку расіян. Таму варта і надалей паклапаціцца аб турыстычнай прывабнасці і развіцці інфраструктуры на бязвізавай тэрыторыі «Брэст — Гродна».

«Дарэчы, ***мы ў свой час свядома пайшлі на ўвядзенне «бязвізу». Мы разумелі, што нам гэта выгадна. Мы ад гэтага атрымалі нармальныя грошы»,*** — расказаў кіраўнік краіны.

Што датычыцца Гродзенскай вобласці, то тут перапляліся розныя культурныя, нацыянальныя, рэлігійныя традыцыі, якія дэманструюць высокую ступень талерантнасці і ўзаемаразуменне паміж людзьмі. Таму невыпадкова менавіта Гродна стала месцам правядзення Рэспубліканскага фестывалю нацыянальных культур.

«Калі я гляджу на гэты фестываль — шматкультурны, рознагалосы, — радуюся за гродзенцаў. Гэта сапраўднае культурнае дасягненне, якое можна паставіць на ўзровень са «Славянскім базарам». За гэта нас і паважаюць ва ўсім свеце», — падзяліўся беларускі лідар.

## «НЕ ТАКІЯ КАРАНАВІРУСЫ Ў НАШАЙ ГІСТОРЫІ БЫЛІ»

Пасля нарады Аляксандр Лукашэнка прыехаў на «Гродна Азот», дзе яму далажылі пра стан спраў і выкананне яго даручэнняў па развіцці прадпрыемства. Заслухоўваючы інфармацыю пра мадэрнізацыю і новыя вытворчасці, кіраўнік дзяржавы цікавіўся, ці ёсць попыт на прадукцыю, якая на іх вырабляецца, колькі каштуе рэалізацыя інвестыцыйных праектаў і колькі часу на гэта патрабуецца.

На заканчэнне візіту адбылася гутарка з супрацоўнікамі аб'яднання. Аляксандр Лукашэнка адразу ж спытаў, ці чакаюць ад яго адказу наконт пабудовы новага азотнага комплексу ў Гродне.

Кіраўніцтва прадпрыемства ўпэўненае ў гэтым, заўважыў Прэзідэнт, але сам ён лічыць, што трэба параіцца з людзьмі, бо другі варыянт — будаваць у Віцебскай вобласці. Менавіта таму выбар беларускага лідара пры наведванні рэгіёна прыпаў на «Гродна Азот», растлумачыў ён, хоць галоўная мэта прыезду сюды — сустрэча з актывам, бо характар сітуацыі гэтага вымагае. І каранавірус — адна з акалічнасцяў сённяшняга дня.

Адказваючы на пытанні, кіраўнік дзяржавы адзначыў, ***што Беларусь і іншыя краіны ў розныя гады сутыкаліся з усплёскам розных вірусаў і з усімі праблемамі атрымалася справіцца. «Перажывём і гэта. Не такія каранавірусы ў нашай гісторыі былі, але мы жывыя. Галоўнае — захаваць сваю зямлю, свой кавалак зямлі для сябе і для нашых дзяцей»,*** — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт выказаў упэўненасць у тым, што Беларусь абрала правільны шлях барацьбы з эпідэміяй.

«Той, хто ізаляваў народ, атрымаў другую хвалю», — заявіў ён.

Аляксандр Лукашэнка дадаў: і ў нас не ўсё ідэальна, але факты сведчаць, што сітуацыя наладжваецца. У Гродне таксама хварэюць людзі, ёсць і цяжкія выпадкі, але выпісваецца з бальніц ужо больш, чым трапляе туды.

Прэзідэнт станоўча выказаўся пра беларускіх урачоў, што, як і ўрачы ўсяго свету, не ведаючы асаблівасцяў гэтай хваробы, не маючы ад яе лекаў, знайшлі спосабы, якія дапамаглі прадухіліць перагрузку сістэмы аховы здароўя і тым самым выратаваць многія жыцці.

Аляксандр Лукашэнка параіў добра сачыць за сваім здароўем і займацца спортам.

## ТАРЫФЫ БУДУЦЬ ВЫГАДНЫЯ

Работнікі завода пацікавіліся, ці змогуць гараджане-дачнікі разлічваць пасля ўводу АЭС у эксплуатацыю на тое, што з'явіцца дзяржпраграма па электрыфікацыі садовых таварыстваў, каб з цягам часу была магчымасць пабудаваць там загараднае жыллё. Гэта можа стаць добрай падмогай для тых, хто мяркуе ўладкавацца там на працяглы перыяд, а не толькі на лета.

Аляксандр Лукашэнка лічыць гэтае пытанне вельмі актуальным.

«Калі быў у Полацку, пачаў там размову са спецыялістамі ЖКГ з таго, што ў пандэміі ёсць станоўчы фактар. ***Стала відавочна, што такое вёска. Калі ў кагосьці ёсць дача, там могуць і бацькі жыць, і дзяцей туды можна адвезці, бо на вёсках адзінкі хварэюць. Таму я за тое, каб больш скіроўваліся на вёску».***

Прэзідэнт паведаміў, што ***ў канцы года мяркуецца прыняць рашэнне, каб старыя дамы аддаць людзям альбо нядорага прадаць.*** Гэта павінна заахвоціць да куплі дамоў на хутарах ці ў неперспектыўных вёсках. Дзяржава будзе гэта падтрымліваць. Таксама будзе актыўна праводзіцца пераход на шырэйшае спажыванне электрычнай энергіі.

«Летась мы атрымалі ад насельніцтва 12 тысяч адпаведных заявак, але рэалізаваць змаглі частку, бо не хапае магутнасці сетак... Таму стаіць задача забяспечыць іх налета абсталяваннем. Зробім тарыфы ніжэйшымі», — паабяцаў лідар краіны.

## ВЫБАРЫ ВЫБАРАМІ, АЛЕ ГАЛОЎНАЕ — УБОРКА

Вытворцы мінеральных угнаенняў пацікавіліся, ці не перашкодзіць выбарчая кампанія ўборачнай. Аляксандр Лукашэнка адказаў на гэта, што сёлетняя пасяўная прайшла своечасова, хоць яна суправаджалася пачаткам пандэміі. ***«Пандэмія, выбары — яны скончацца, а есці нам заўсёды хочацца»,*** — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён нагадаў, якія былі праблемы з харчаваннем у 1990-х: ежу раздавалі па талонах. ***«Не дай бог, зноў вярнуцца да гэтага. Мы да гэтага ўжо ніколі і не вернемся»,*** — упэўнены Прэзідэнт.

«Мы добра правялі пасяўную, своечасова пасеялі, і надвор'е спрыяе ўраджаю, вільгаці хапае. ***Яшчэ крыху вытрымаць у такім рэжыме — і мы будзем з хлебам, і не толькі з хлебам.*** Значна пашырылі пасевы важных для нас культур — і бульбы больш, і грэчкі. Мы поўнасцю сябе забяспечым, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — ***Выбары — не выбары, галоўнае для нас зараз, на што я накіроўваю ўсіх сваіх падначаленых, — гэта ўборка.*** Усё, што трэба людзям, мы вырабляем. ***Адзінае — каб расла заработная плата. Таму будзем імкнуцца, каб у будучай пяцігодцы ў два разы павялічылася зарплата, асабліва ў настаўнікаў, урачоў.*** І выбары правядзём, не хвалюйцеся. І хлеб убяром, і бульбу. ***Галоўнае, каб мы краіну не страцілі».***

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА,**
**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Блізкая ўлада

# АДКЛАД НЕ ІДЗЕ Ў ЛАД

**На прыём грамадзян, які правёў у Слуцку першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў, запісалася 50 чалавек. Шмат зваротаў датычылася зямельных адносін і спрэчак.**



Фота БелТА.

Так, па зямельным пытанні звярнулася саўладальніца драўлянага дома ў межах участка, дзе знаходзіцца сем самавольных пабудоў. Жанчына доўгі час нічога не рабіла, каб іх узаконіць. Мясцовыя ўлады прынялі рашэнне аб зносе пабудоў, затым яго адмянілі. У выніку было вынесена пяць рашэнняў, якія паступова адмяняліся. Лёс збудаванняў не вырашаны і сёння. Прызначана чарговае судовае пасяджэнне.

Яшчэ адна жыхарка з-за зямлі канфліктуе з суседам, які самавольна ўзвёў пабудову на ўчастку і перакрыў праход для заяўніцы. Самастойна знайсці кампрамісны варыянт суседзі не могуць.

Гадамі цягнецца канфлікт паміж двума грамадзянамі. У 1970 годзе яны ўзвялі два дамы на адным участку. Цяпер не могуць падзяліць зямлю, якая да гэтага часу не афармлена. З'явіліся праблемы з самавольнымі пабудовамі, якія давялося прымусова знесці. Заяўніца не згодна з новым рашэннем аб падзеле ўчастка, як і з прадпісаннем аб зносе гаспадарчых пабудоў. Маўляў, яна плаціла падаткі за ўвесь участак і мае права захаваць яго ў ранейшых межах.

Максім Рыжанкоў заўважыў, што падчас адной з рабочых паездак Прэзідэнт звярнуў увагу насельніцтва на магчымасць набыцця зямельных участкаў у рэгіёнах, навядзення парадку каля закінутых пабудоў, а таксама на магчымасць будаўніцтва прыватных дамоў і дач. «Пры гэтым Прэзідэнт кажа, што трэба максімальна спрасціць зямельныя працэдуры. А на справе сутыкаешся з тым, што цябе акунаюць у тыя пытанні, якія склаліся яшчэ ў савецкія часы. Аднак тады не было такой задачы — пагалоўна афарміць усе ўчасткі. Сёння я задаю сабе пытанне: як мясцовай уладзе выканаць даручэнні Прэзідэнта аб выдзяленні ўсіх гэтых зямельных участкаў? **У многім карані праблем па зямельных спрэчках хаваюцца ў не зусім правільна прынятых калісьці рашэннях землеўпарадкавальных службаў, калізіях заканадаўства.** На мясцовым узроўні трэба актыўней падыходзіць да гэтай работы і не адкладваць вырашэнне такіх пытанняў», — цытуе БелТА першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта.

Тым часам выязныя мерапрыемствы з удзелам прадстаўнікоў Адміністрацыі Прэзідэнта працягваюцца. Заўтра, **18 чэрвеня, у Мёрскім райвыканкаме начальнік галоўнага ўпраўлення кадравай палітыкі Юрый Васілевіч КРЫВАШЭЕЎ з 10 да 12 гадзін** правядзе прамую тэлефонную лінію, а **ў 12.00** пачнецца асабісты прыём грамадзян. **У пятніцу, 19 чэрвеня, у Слонімскім райвыканкаме з 10 да 12 гадзін** пройдзе прамая тэлефонная лінія з удзелам **Яўгена Іосіфавіча КАВАЛЕНКІ, начальніка галоўнага дзяржаўна-прававога ўпраўлення, з 12 гадзін** пачнецца асабісты прыём грамадзян.

Нумары тэлефонаў прамых ліній размешчаны на сайтах мясцовых органаў улады.

# На ўнутраны і знешні рынак

**З запускам новай вытворчасці «Белмедпрэпараты» змогуць практычна цалкам закрыць патрэбы ўнутранага рынку ў проціпухлінных прэпаратах. Пра гэта паведаміў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Ігар ПЕТРЫШЭНКА падчас наведвання прадпрыемства. Дарэчы, інвестпраект таксама дасць магчымасць павялічыць і экспартныя пастаўкі.**

«Гэта новая вытворчасць вельмі важных прэпаратаў — процірухлінных. У першую чаргу гэта важна для задавальнення патрэб унутранага рынку, мы практычна выйдзем на стоадсоткавае закрыццё патрэб па проціпухлінных прэпаратах», — перадае БелТА словы Ігара Петрышэнкі.

На новай, сучаснай вытворчасці прадпрыемства цяпер ідзе падбор высокакваліфікаванага персаналу, які можа правільна эксплуатаваць абсталяванне.

«Аналагічныя лініі ўстаноўлены на Барысаўскім заводзе медпрэпаратаў, які з выкарыстаннем перадавых тэхналогій выпускае прадукцыю, важную для ўнутранага і знешняга рынкаў», — расказаў віцэ-прэм'ер.


Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703 |
| Продавец | **ОАО «Гомельский завод пусковых двигателей имени П. К. Пономаренко»,** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, д. 150 |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703. Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**

| № лота | Наименование (назначение) | Инв. № | Общ. пл. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Здание заправочной склада ГСМ** (здание неустановленного назначения). **Составные части и принадлежности**: железобетонный островок под топливозаправочными колонками, резервуар (3 шт.), емкость (15 шт.), емкость для эмульсий (2 шт.). **Адрес**: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/21 | 350/С-204136 | 35,5 кв. м |
| | **Открытый склад металла** (сооружение специализированное складов, хранилищ). **Составные части и принадлежности:** площадка (мощение), подкрановые пути козлового крана (2 шт.), ограждение, ворота (2 шт.), склад. **Адрес**: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/22 | 350/С-204137 | 3 203,7 кв. м |
| | **Склад лакокрасок, ГСМ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ). **Составные части и принадлежности**: пристройка. **Адрес**: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150В | 350/С-210707 | 186 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,8037 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания открытого склада металла с участком лакокрасок и ГСМ | | |
| | **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства. **Составные части и принадлежности**: бордюр. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-209431 | 40 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0262 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| | **Ангар участка нестандартного оборудования** (здание неустановленного назначения). **Составные части и принадлежности**: ангар, площадка, три ограждения, ворота. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/20 | 350/С-206388 | 369,1 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,4458 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания ангара участка нестандартного оборудования | | |
| | **Начальная цена (с НДС 20%) – 422 188,58 бел. руб.** | | |
| 2 | **Производственное помещение** (производственное помещение). **Составные части и принадлежности:** пристройка (11 шт.), склад ОКСа, прессовый участок, навес, подкрановые пути, две автомобильные дороги, два ограждения. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/2-1 | 350/D-298466 | 9 108,2 кв. м |
| | **Магазин** (здание специализированное розничной торговли). **Составные части и принадлежности:** две пристройки, крыльцо. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-74042 | 162 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 1,6127 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания ремонтно-механического цеха и здания специализированного розничной торговли | | |
| | **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). **Составные части и принадлежности:** автодорога, бордюр, ворота, ограждение. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-209429 | 575 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0575 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| | **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства). **Составные части и принадлежности**: бордюр. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-209430 | 187 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,1258 га, предоставлен на праве постоянного пользования для размещения объектов иного назначения | | |
| | **Начальная цена (с НДС 20 %) – 2 529 731,03 бел. руб.** | | |
| 3 | **Здание специализированное обрабатывающей промышленности (участок механической обработки)** (здание специализированное обрабатывающей промышленности). **Составные части и принадлежности:** пристройка, навес, здание подкачки и монтажа шин, помещение склада участка безрельсового транспорта, гараж, склад металла, ворота, калитка, три ограждения, канава для осмотра автомашин. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/ 17 | 350/С-167815 | 837,1 кв. м |
| | **Цех безрельсового транспорта** (здание специализированное транспорта). **Составные части и принадлежности:** две пристройки, площадка, два ограждения, четыре отстойника **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150/16 | 350/С-75350 | 569,8 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,6481 га, предоставлен на праве постоянного пользования для содержания и обслуживания здания специализированного транспорта, здания специализированного складов | | |
| | **Автомобильная дорога на территории** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства) **Составные части и принадлежности**: бордюр. **Адрес:** Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 150 | 350/С-209428 | 93 кв. м |
| | **Сведения о земельном участке:** общ. пл. 0,0864 га, предоставлен на праве постоянного пользования для строительства и обслуживания подъездной автомобильной дороги к капитальным строениям (зданиям, сооружениям), изолированным помещениям в капитальных строениях (зданиях, сооружениях) | | |
| | **Начальная цена (с НДС 20%) – 642 460,28 бел. руб.** | | |

**Задаток 10 % от начальной цены лота** перечисляется на р/с № BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **15 (пятнадцать) рабочих дней** после проведения аукциона |

**Условия оплаты предмета аукциона**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель аукциона либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи предмета аукциона в течение **3 (трех) рабочих дней** со дня проведения аукциона

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 19.05.2020

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**

Начало торгов: **11.00 10.07.2020**. Окончание торгов: **12.00 10.07.2020.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок**

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 08.07.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 44-704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |



Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| Продавец | **ОАО «БЕЛВТОРРЕСУРСЫ»,** г. Минск, ул. Казинца, дом 2, кабинет 21, 220099 |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
**Лот № 1 – недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. Загородная, 4**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Арочный склад** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 933,2 кв. м | 122/С-12457 |
| **Павильон-магазин** (здание специализированное организаций оптовой торговли, материально-технического снабжения и сбыта продукции). **Составные части и принадлежности:** уборная деревянная, две кабельные линии ВЛ-0,4 кв., забор металлический, колодец, колодец с пожарным гидрантом, покрытие из железобетонных плит | 352,6 кв. м | 122/С-12455 |
| **Склад ГСМ** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 14,1 кв. м | 122/С-12458 |
| **Склад твердого топлива** (здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ) | 10,5 кв. м | 122/С-12456 |
| **Домик для сторожа** (здание нежилое) Составные части и принадлежности: холодная пристройка | 13,7 кв. м | 122/С-12454 |
| **Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,6435 га для обслуживания филиала оптовой торговли | | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **304 272,00 белорусского рубля** | |

**Лот № 2 – недвижимое имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Брестская обл., Лунинецкий р-н, г. Лунинец, ул. Бохоново, 3**

| Наименование (назначение) | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Навес** (сооружение специализированное складов, хранилищ) Составные части и принадлежности: забор из сетки стальной, инв. № 11223, КЛ-0,4 кВ, инв. № 612, кабель | 279,8 кв. м | 133/С-14726 |
| **Склад с пристройкой** (склад) | 46,6 кв. м | 133/С-14724 |
| **Сведения о земельном участке**: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,4102 га для обслуживания производственной базы | | |
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **33 469,92 белорусского рубля** | |

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки»**

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение 1,5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
Начало торгов: 10.00 **22.07.2020 г.**
Окончание торгов: 12.00 **22.07.2020 г.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

**Дата и время окончания приема заявок:** Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **20.07.2020 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: **www.ipmtorgi.by**

| | |
|---|---|
| **Контактные телефоны** | **+375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |



Центр Промышленной Оценки • Организация аукционов • Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5 |
| Продавец | **Смолевичское районное потребительское общество,** Минская обл., г. Смолевичи, ул. Советская, д. 133 |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б |
| Адрес ЭТП | www.ipmtorgi.by |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение: Минская обл., Смолевичский р-н, Озерицко-Слободской с/с, д. Дуброва, ул. Набережная, д. 2А**

| Наименование | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|
| **Здание магазина** | 97,9 кв. м | 614/С-19231 |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0811 га** предоставлен продавцу на праве аренды (срок действия по 27.01.2070) для обслуживания здания магазина № 49. Ограничения (обременения): водоохранная зона реки и водоема, охранные зоны электрических сетей (пл. 0,0202 га)

**Начальная цена с НДС 20 % – 30 000,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

50 % от цены продажи предмета аукциона оплачиваются в течение 5 банковских дней с момента подписания протокола о результатах открытого аукциона (для снятия запрета, установленного ОПИ), оставшаяся сумма с учетом ранее внесенного задатка оплачивается в течение 1 (одного) месяца после подписания договора купли-продажи

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов – 21.07.2020 в 11.00. Окончание торгов – 21.07.2020 в 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 17.07.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**



**ОАО «КЛИМОВИЧСКИЙ ЛИКЕРО-ВОДОЧНЫЙ ЗАВОД»**
**сообщает, что 02.07.2020 года состоятся электронные торги**
**ПО ПРОДАЖЕ ЗДАНИЯ МАГАЗИНА,**
**расположенного по адресу: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Зеневича.**

Информацию об условиях проведения электронных торгов можно уточнить на сайтах **torgi.gov.by** и **bankrot.gov.by.**

УНП 700103211



## ООО «ИПМ-Консалт оценка» информирует

В извещение о проведении электронных торгов по продаже имущества ООО «САНПЛИТ», опубликованном в газете «Звязда» от 13.06.2020, **вносятся следующие изменения:**
1. Дата начала электронных торгов изменена на **15.07.2020**. Дата окончания торгов изменена на **15.07.2020**.
3. Дата окончания приема заявок изменена на **13.07.2020**

**Контактные данные: +375 (17) 373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: info@ipmtorgi.by**

УНП 191224638



**Считать недействительными утерянные ЗАО «СК «Белросстрах» бланки страховых полисов:**

- «Добровольное страхование от несчастных случаев и болезней на время поездки за границу», формы 2РН, 2РП, серия БИ №№ 1800893, 1268201–1268210, 1286369–1286373, 1350746–1350765, 1389007–1389041, 1406866–1406885,1428522, 1428611–1428620, 1647220, 1825862, 1826118;
- «Добровольное страхование имущества физических лиц; Добровольное страхование гражданской ответственности владельцев квартир», формы 2РН, 2РП, серия БИ №№ 0083874, 0083875, 0049818, 0075195, 0075197.

УНП 100782388



*В соответствии со ст. 56 Гражданского кодекса Республимки Беларусь, ст. 23 Закона Республики Беларусь «О хозяйственных обществах»*
**уведомляем о том, что 10.06.2020 г.**
**ПРИНЯТО РЕШЕНИЕ О РЕОРГАНИЗАЦИИ**
**общества с ограниченной ответственностью «Проперти Менеджмент Групп»**
(зарегистрировано Минским городским исполнительным комитетом 11.06.2013 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192008161)
**в форме выделения из него общества с ограниченной ответственностью.**

Прыёмная кампанія — 2020

# Па электроннай чарзе

## Новыя тэхнічныя нюансы з'явяцца падчас падачы дакументаў у БДУ

**Усе змяненні накіраваны на аператыўную падачу дакументаў, скарачэнне часу знаходжання абітурыента ў памяшканнях прыёмнай камісіі і памяншэнне колькасці людзей, якія там знаходзяцца.**

З гэтай мэтай пашыраны функцыянал асабістага кабінета абітурыента. У прыватнасці, павялічаны пералік дакументаў, якія можна будзе падаць у электронным выглядзе. Акрамя запаўнення анлайн-анкеты, раздрукоўкі заявы і загрузкі фота, абітурыенты змогуць размясціць у кабінеце адсканаваныя атэстат або дыплом, сертыфікаты ЦТ, дакументы, якія пацвярджаюць права на іх ільготы пры паступленні. У прэс-службе БДУ звяртаюць увагу, што электронны рэсурс не замяняе падачу арыгіналаў асабіста абітурыентам, а толькі дазваляе звяртацца адразу ў прыёмныя камісіі сваіх факультэтаў, абмінаючы зоны па выдачы і запаўненні бланкаў, і скараціць такім чынам час свайго там знаходжання.

Яшчэ адной новай функцыяй асабістага кабінета стануць электронныя чэргі для падачы дакументаў. Кожнаму зарэгістраванаму абітурыенту будзе прапанаваны найбольш камфортны час наведвання прыёмнай камісіі. Згаданая паслуга носіць неабавязковы характар. Права выбару часу застаецца за абітурыентам.

Пры правядзенні ўнутраных уступных выпрабаванняў будуць выкананы ўсе санітарна-эпідэміялагічныя меры, паменшаны колькасны склад груп. Рассаджванне на пісьмовых экзаменах арганізуюць з улікам патрабаванняў сацыяльнага дыстанцыявання, для чаго павялічваецца і колькасць аўдыторый. Штодня для прыёму ўступных экзаменаў іх будзе задзейнічана больш за 30.

Таксама сярод новаўвядзенняў гэтага года — правядзенне ўнутраных уступных выпрабаванняў для выпускнікоў устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія паступаюць на скарочаную форму навучання, па адзіных праграмах ва ўсіх ВНУ.

У перыяд прыёмнай кампаніі ў БДУ пачне працаваць «гарачая лінія» са шматканальным тэлефонам (8 017 209 50 85), дзе абітурыенты змогуць атрымаць кансультацыю па любых пытаннях, якія датычацца паступлення.

# Плюс тры новыя рабочыя прафесіі...

**15 чэрвеня стартавала прыёмная кампанія ва ўстановах прафесійна-тэхнічнай адукацыі.**

Прыём вядуць 127 такіх устаноў па больш чым 260 прафесіях. Акрамя таго, падрыхтоўку па рабочых прафесіях ажыццяўляюць 44 установы адукацыі іншых узроўняў, якія таксама рэалізуюць адукацыйныя праграмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі.

Усяго на ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі плануецца прыняць 28,4 тысячы чалавек, з іх за кошт сродкаў бюджэту — 28,2 тысячы. На аснове агульнай базавай адукацыі —18,1 тысячы чалавек, на аснове агульнай сярэдняй — 8,2 тысячы і на аснове спецыяльнай адукацыі — 400 чалавек.

У мэтах гнуткага рэагавання на патрэбы рэгіянальных рынкаў працы штогод удасканальваецца структура падрыхтоўкі кадраў. Сёлета плануецца адкрыць падрыхтоўку па 133 новых для асобных устаноў прафтэхадукацыі прафесіях. З новых прафесій, па якіх падрыхтоўка ў краіне раней не вялася, — кушнер-раскройшчык, апаратчык выцяжкі і заліўшчык металу.

У структуры прыёму будуць захаваны тэндэнцыі мінулых гадоў: спецыяльнасці рэальнага сектара эканомікі складуць амаль 75 працэнтаў.

На ўзровень прафесійна-тэхнічнай адукацыі прымаюцца асобы, якія маюць агульную базавую, агульную сярэднюю або спецыяльную адукацыю.

Прыём дакументаў для атрымання прафесійна-тэхнічнай адукацыі на дзённай форме ажыццяўляецца з 15 чэрвеня да 20 жніўня. Калі да канца тэрміну прыёму дакументаў колькасць пададзеных заяў на асобныя прафесіі будзе меншая за запланаваную колькасць месцаў, установа адукацыі па ўзгадненні з заснавальнікам можа падоўжыць тэрмін прыёму дакументаў і залічэння ў склад навучэнцаў да поўнага ўкамплектавання груп, але не пазней чым да 15 верасня бягучага года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Экапрастора

# «ПЛАЧУ НА ПЛАСТЫК»

## Танцавальны кліп пра асобны збор смецця

**зрабіла арганізацыя «Рух «Мэта 99» як вынік танцавальнага чэленджа, прымеркаванага да Сусветнага дня абароны навакольнага асяроддзя, які сёлета ААН прапанавала адзначыць дзеля прыроды. Кліп «Плачу на пластык» (https://youtu.be/1t0ds35AJqc) стаў гэткім экалагічным варыянтам нашумелага відэароліка «Плачу на тэхна».**




Героі роліка танцуюць на рабоце, дома і нават на гомельскім заводзе па перапрацоўцы пластмасавых адходаў. Створана відэа з работ, якія дасылалі ўсе, каго хвалюе тэма сарціроўкі смецця, у прыватнасці пластыку, расказалі ў дзяржаўнай установе «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».

Летась у Беларусі сабралі 765 тысяч тон другаснай сыравіны, 97,2 тысячы тон з якіх — адкіды палімераў. Больш за палову беларусаў ужо выкідаюць пластык асобна, а выкарыстанне камунальнага смецця дзякуючы збору ДМР падрасло амаль да 23 %.

— *Задача чэленджа — звярнуць увагу на тое, што нам пад сілу пазбавіцца ад гор пластыкавага смецця, — калі кожны крыху зменіць свае звычкі і адмовіцца ад лішніх аднаразовых рэчаў, а адходы ўпакоўкі будзе адпраўляць на перапрацоўку, выкідваючы іх у кантэйнеры для ДМР, ці здаваць у пункты нарыхтоўкі другаснай сыравіны,* — упэўнена **Наталля ГРЫНЦЭВІЧ, дырэктар арганізацыі «Аператар ДМР».** — *Нам важна быць пачутымі. Для гэтага мы ўжываем новыя формы дыялогу з гледачом.*

Час задумацца над тым, што мы жывём толькі дзякуючы прыродзе і залежым ад прыродных узаемасувязяў, заклікаюць прадстаўнікі «Аператара ДМР».

— *За першы квартал 2020-га ў краіне для перапрацоўкі сабрана 23,1 тысячы тон адходаў пластыку. У параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года збор павялічыўся амаль на 4 %,* — падзялілася **Ніна КУЛЬБЕДА-КАМШЫЛАВА, галоўны спецыяліст па інфармацыйнай рабоце дзяржаўнай установы «Аператар другасных матэрыяльных рэсурсаў».** — *Лідзіруюць па зборы адходаў пластыку ў Беларусі Мінск і сталічная вобласць, якія летась адсарціравалі адпаведна на 38 % і 31 % больш палімераў. Усяго па краіне ўстаноўлена ўжо больш за 30 тысяч кантэйнераў для збору пластыкавых адходаў.*

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

# ПЯРУН РАЗБУШАВАЎСЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Але здараецца і так, што людзі гінуць ад маланак падчас сваёй работы. У групе рызыкі — пастухі, якія мусяць знаходзіцца на адкрытай мясцовасці цэлы дзень. Летась на Гомельшчыне навальніца стала прычынай гібелі двух прадстаўнікоў гэтай прафесіі. Удзень у адну з чэрвеньскіх нядзель два пастухі заганялі жывёл на лузе паблізу адной з вёсак Кармянскага раёна. У гэты момант ударыла маланка. Адзін з пастухоў упаў на месцы, другі падбег да яго, паспрабаваў аказаць першую дапамогу, але марна. Урачам хуткай дапамогі заставалася толькі канстатаваць смерць 54-гадовага мужчыны. А ў жніўні электрычны разрад забіў 27-гадовага пастуха ўжо ў Рагачоўскім раёне. Перадгісторыя трагедыі — такая ж, як і ў першым выпадку.

Што ж рабіць у такім выпадку?

— Самае непрыемнае — гэта калі непагадзь заспела вас на адкрытай мясцовасці, дзе нельга схавацца ў якім-небудзь памяшканні на той час, пакуль не праляціць навальніца, — заўважае **афіцыйны прадстаўнік Мінскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях Настасся ШВАЙБОВІЧ.** — Самыя небяспечныя месцы — гэта ўзвышшы, лініі электраперадачы і іх апоры. Таму лепш за ўсё пашукаць паблізу якую-небудзь яму ці яр. Гэта неабходна для таго, каб не быць самым высокім аб'ектам для мясцовасці — менавіта ў іх, як правіла, цаляе электрычны разрад. Але калі часовы прыстанак аператыўна знайсці не ўдалося, то адзінае, што застаецца, — прысесці на кукішкі ў позе эмбрыёна. Пуні і стагі саломы лепш абыходзіць — калі маланка туды трапіць, іх імгненна ахопіць пажар. Рыдлёўкі, вуды і іншыя доўгія прадметы, зробленыя з вуглепластыку або металу, выдатна праводзяць ток, таму іх трэба адкінуць як мага далей ад сябе.

Ёсць свае асаблівасці і ў тым, як хавацца ад маланкі ў лесе. Асобныя высокія дрэвы варта абыходзіць. Па статыстыцы, частымі ахвярамі маланкі становяцца дубы, таполі і вязы. Клёны і бярозы «трапляюць пад раздачу» крыху радзей. Таму найлепшы прыстанак — сярод дрэў з нізкай кронай. Пры гэтым трэба агледзецца — ці няма паблізу дрэў, раней пашкоджаных маланкамі. Гэта значыць, што грунт тут мае добрую электраправоднасць, і не выключана, што маланку сюды пацягне яшчэ раз.

А вось вогнішча ў навальніцу — дрэнны памочнік. Нават калі яго і не патушыць да канца дождж, то высокая імавернасць таго, што ён прыцягне разрад, — слуп нагрэтага паветра з'яўляецца добрым правадніком электрычнасці.

— Не вельмі добра, калі непагадзь заспела на вадаёме, — вакол вас проста ідэальны праваднік электрычнага току, — працягвае Настасся Швайбовіч. — Лепш за ўсё грэбці да берага, але калі гэтага зрабіць не ўдалося, то адзінае, што застаецца, — абараніць сябе ад вільготнага. Для гэтага неабходна ўзняць тэнт, пераадзецца ў сухое, падкласці пад сябе выратавальную камізэльку.

Аўтамабіль падчас навальніцы з'яўляецца добрым прыстанкам. Тут усё проста — пажадана спыніцца на ўзбочыне, зачыніць вокны, спусціць антэну і заглушыць рухавік. А вось да ручак дзвярэй лепш не дакранацца.

Лепш за ўсё, калі навальніца заспела вас дома. У такім разе проста трэба закрыць усе вокны і адключыць электрапрыборы. Лепш адысці ўглыб пакоя — не выключана, што разрад можа адбыцца каля вашых вокнаў.

— Чаму лічыцца, што ў нашых прадзедаў зубы былі мацнейшыя? Бо яны ўжывалі шмат цвёрдай ежы. Сёння наш рацыён часта складаецца з мяккіх прадуктаў. У выніку перыядонт не атрымлівае нагрузкі і не трэніруецца, — заўважае Андрэй Мацвееў. — Лячэнне мезенхімальнымі ствалавымі клеткамі прыпыняе рэзорбцыю касцявой тканкі, здымае запаленне слізістай, умацоўвае яе і прадухіляе далейшае развіццё хваробы. У некаторых выпадках магчыма нават аднавіць касцявую тканку, але гэта дастаткова марудны працэс. Нядаўна ў нас была пацыентка з Гомеля — маладая жанчына, якая прайшла курсы традыцыйнага лячэння, але вынікаў не атрымала. Мы яе накіравалі на кафедру для лячэння ствалавымі клеткамі — мяркуем, што хваробу ўдасца спыніць.



Андрэй Мацвееў кажа, што сёння няма праблем з даступнасцю стаматалагічнага лячэння нават у невялікіх населеных пунктах. А ў самых складаных выпадках пацыент можа быць накіраваны ў Мінск.

— Я некалі спецыяльна падлічваў: у нашай краіне самае вялікае «пляччо» даезду да стаматолага складае каля 30-40 кіламетраў. Цягам сутак пры неабходнасці можна атрымаць дапамогу. Калі пацыенту не могуць дапамагчы на раённым узроўні, ён накіроўваецца на наступны — абласны. Калі і там складанасці — на рэспубліканскі, у нашу паліклініку. Літаральна ўчора ў нас быў запыт з Гомельскай вобласці. Пацыент, а на сёння ён студэнт універсітэта, лечыцца з чатырох гадоў. Касцявая тканка расце, шкілет мяняецца, па ўзросце яму робяць аперацыі. Цяпер неабходна завяршыць артадантычнае лячэнне з прымяненнем хірургічнага ўмяшання. Яму будзе разрэзана ніжняя сківіца і з дапамогай дыстракцыйных апаратаў выцягнута наперад, што надасць функцыянальнасць і эстэтычны выгляд. Такія ўмяшанні робяцца ў буйных клініках — Мінскай абласной бальніцы, 11-й бальніцы, 4-й дзіцячай. Пацыент накіраваны ў Мінск і, нягледзячы на тое што ён ужо дарослы, яго лячэнне завершыць доктар, які займаўся ім з чатырохгадовага ўзросту, — расказвае суразмоўца.

Дарэчы, на базе Рэспубліканскай стаматалагічнай паліклінікі працуюць восем кафедраў стаматалагічнага факультэта БДМУ, іх прафесарска-выкладчыцкі склад кансультуе ў самых няпростых выпадках. Трапіць да спецыялістаў паліклінікі можна і без накіравання — на платнай аснове.

— У нас, на жаль, сустракаюцца пацыенты з такім захворваннем, як першасная поўная адэнтыя. Гэта маленькія дзеці, якія нараджаюцца без зубных зачаткаў. Іх няшмат — да аднаго-двух дзясяткаў у краіне. Дацэнты кафедры дзіцячай стаматалогіі займаюцца пратэзаваннем такіх пацыентаў: пачынаюць з 4-6 гадоў і вядуць іх да 18-20 гадоў. Спачатку вырабляюцца цалкам здымныя пратэзы, а калі заканчвацца фарміраванне тваравага шкілета, такому пацыенту праводзяць імплантацыю, каб на пастаяннай аснове замацаваць зубы.

### Адбельваць зубы — толькі ў медустановах

Касметалагічныя паслугі застаюцца запатрабаваныя, хоць і такіх пацыентаў стала цяпер крыху менш. Па-ранейшаму адна з самых папулярных працэдур — адбельванне зубоў. Андрэй Мацвееў папярэджвае, што яно не такое бясшкоднае, як можа здавацца, і заклікае рабіць яе толькі ў прафесіяналаў.

— Адбельванне зубоў абумоўлена модай: дваццаць гадоў таму ніхто не казаў, што трэба мець белыя зубы, — усе хацелі мець здаровыя зубы. Калі пацыент ідзе на адбельванне ў структуры, якія не маюць ліцэнзій на медыцынскую дзейнасць, у такіх выпадках ён бярэ адказнасць на сябе. Нягледзячы на тое, што ў сучасных матэрыялах могуць адсутнічаць кіслоты і некаторыя іншыя шкодныя рэчывы, усё роўна яны ўплываюць на эмаль зуба. Калі ў вас прыродны колер эмалі А3 ці А2,5, то змяніць яе на два тоны і зрабіць белай, як аркуш паперы, проста так не атрымаецца. Трэба штосьці адтуль прыбраць і штосьці дадаць. Эмаль, нягледзячы на дастатковую цвёрдасць, не вытрымлівае ўздзеяння агрэсіўных прэпаратаў. Яна робіцца порыстая, у яе трапляюць харчовыя фарбавальнікі, і адбельванне становіцца працэдурай, на якую пацыент «падсаджваецца». Акрамя таго, змяненне структуры эмалі вядзе да развіцця карыесу, які, адпаведна, запускае пульпіт і парадантыт. Таму адбельванне можна рабіць толькі ў медыцынскіх установах пад кантролем доктара.

**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Весткі з месцаў

# ВОЧЫ БАЯЦЦА...

**У Радашковічах, у касцёле Найсвяцейшай Тройцы, ідуць работы па аднаўленні аргана. Рэстаўрацыяй інструмента займаецца майстар Маскоўскай філармоніі Дзмітрый Лотаў, які раней вярнуў да жыцця арган у недалёкім ад нас мястэчку Краснае.**







«Убачыўшы гэты інструмент упершыню, я прыйшоў у жах, — кажа ён. — Гэта была проста куча дэталяў... Толькі потым, добра прыгледзеўшыся, я зразумеў, што з іх можна нешта зрабіць».

На сённяшні дзень устаноўленыя апошняя віндлада (скрыня, на якой стаяць трубы) і 10 рэгістраў (усяго іх каля 20). Зараз трэба падключаць трактуру, рабіць новы праспект... Гэта вельмі маштабная задача.

Але ж, трэба меркаваць, удзячная, бо, па словах майстра, самы стары з арганаў знаходзіцца ў Швейцарыі, і вялікая частка яго рэгістраў працуе з 1390 года. Ёсць арганы, якім 400 гадоў... Хочацца спадзявацца, што пасля рамонту столькі ж праслужыць і наш.

**Алеся Давідовіч,**
*г. п. Радашковічы, Маладзечанскі раён.*

Перажытае — незабытае

# Дуб-выратавальнік



**...Гэта аблава ў 1944-м была, здаецца, апошняй. І вяскоўцаў пра яе ніхто, на жаль, не папярэдзіў, таму людзі заставаліся дома — хто ў хатах, хто ў зямлянках... А гітлераўцы між тым ужо гойсалі па вёсцы, выганялі ўсіх на вуліцу. Натоўп рос і пад канвоем ішоў да царквы.**

Там па камандзе перакладчыка з яго ўтварылася падабенства шарэнгі. Паўз яе, памалу, ішлі некалькі немцаў — адбіралі на нешта асобных дзяцей і дарослых, «выцягвалі» з натоўпу... Малыя пры гэтым плакалі, рваліся назад, але немцы трымалі іх вельмі моцна.

Мой брат Васіль, якому ішоў толькі восьмы год, ростам быў зусім невялічкі, але ж досыць кемлівы, яго шмат чаму навучыла вайна. Немец толькі памкнуўся, вось-вось гатоў быў схапіць яго за кашулю, аднак Вася зрабіў крок назад і даўся наўцёкі...

Каля могілак, што раскінуліся вакол Кашэвіцкай царквы, раслі розныя кусты і дзядоўнік. Хлопчык сігануў туды. Фашыст кінуўся напярэймы, аднак, убачыўшы, што разагнацца не можа, стаў страляць. Вася ж якраз дабег да старога дуба, нырнуў у дупло і праз пару хвілін пачуў, як за некалькі крокаў прабег немец.

У пошуках малога ён потым доўга шнарыў па могілках, моцна лаяўся, зазіраў у густыя кусты арэшніку, страчыў з аўтамата па царкве, але хлопчыка так і не знайшоў. Вася стаяў у дупле, аж пакуль цягнік не адправіўся ў Германію. Ногі ў хлопчыка зацяклі, цела стала нібы чужое... Насілу ён вылез са схованкі і дамоў, у зямлянку, тады не пайшоў — накіраваўся ў вёску Яўсеевічы да бабулі Веры.

...Кожны раз, калі бываю ў Кашэвічах, абавязкова наведваю царкву, якая без адзінага цвіка была пабудавана ў 1642 годзе, і абавязкова — свой дуб.

Колькі яму гадоў, сказаць цяжка. Дзед расказваў, што ў трыццатых гадах мінулага стагоддзя яго моцна пашчапаў пярун. Значыць, ужо быў высокі?

А царкву ў пачатку вайны фашысты ператварылі ў астрог для палонных чырвонаармейцаў. Тады ж планавалі зрэзаць дрэва, але нешта не атрымалася: дуб застаўся стаяць.

Што цікава, дупло ў ім з часам змянілася: і цяпер, калі глядзець на яго здалёк, можна ўбачыць выяву Божай маці. І таму кожны вернік, які ідзе ў царкву, абавязкова спыняецца каля дрэва.

Апошнія гады дуб прыцягвае да сябе паломнікаў. Нават з краін-суседак — з Расіі, з Украіны — людзі прыязджаюць не толькі паглядзець на гэты цуд прыроды, але і памаліцца, атрымаць дапамогу. Найперш — у лячэнні хвароб.

**Уладзімір Пугач,**
*аг. Навасёлкі, Петрыкаўскі раён.*

Свой погляд

# На ўсё воля божая

**...Трэба захоўваць дыстанцыю, насіць маску, не абдымацца... Трэба — каранавірус. Але адчыняеш дзверы, да цябе з радасным «баба!» бяжыць унучка, і...**
**Пакуль мыеш рукі (не дай бог што — сам сабе не даруеш), яна ўжо горка плача. Няхай лепш цяпер?**

Суседка жаліцца — дачка хоча прыехаць дадому, даўно не была, сумуе. Пытаецца, што ёй сказаць: «Прыязджай, бо я таксама сумую», ці «Не прыязджай, бо раптам...»?

Я не ведаю.

Альбо іду па вуліцы, спяшаюся, нехта са знаёмых спыняецца, каб падвезці. На аўтамаце саджуся ў машыну, з сумкі дастаю маску: не столькі для сваёй абароны — каб не нашкодзіць чалавеку, які зрабіў дабро...

(Хоць на добры толк мне б, відаць, лепш не садзіцца ў машыну. А яму? Не спыняцца?)

...У паліклініцы просяць трымаць дыстанцыю. Адступаю колькі крокаў назад, назіраю за жанчынай. Яна рукою трэ нос пад маскай, потым сцягвае яе пад падбароддзе, зноў нацягвае. Гэта міжволі? Ці маска ёй так — для галачкі?

А «на гарызонце» між тым яшчэ адзін аб'ект для назірання: мужчына без маскі, яго просяць надзець — кажа, што дома забыўся, прапануюць купіць — грошай з сабою таксама няма... Але пры гэтым — «Мне вельмі дрэнна... Дайце талон да доктара».

Нехта чарговы раз перад выбарам: адправіць па маску ці ўсё ж?..

...Іду дадому. Насустрач маці з дзіцем і цэлай «аблачынай» паветраных шароў — відаць, на свята? У некага дзень народзінаў.

«Якія безгаловыя», — думаю пра іх... А з іншага боку — ці можа адзінота стаць святам, тым больш для дзяцей?

...У вагон электрычкі заходзіць жанчына і тут жа бярэцца за... дэзынфекцыю: нечым пырскае на свае рукі ў пальчатках, на тэлефон, апрацоўвае сумку, сядзенне.

Мужчына побач пачынае кашляць (алергія, відаць?). Жанчына ў крыўду: маўляў, ездзяць тут... Калі кашляеш, — дык дома сядзі.

У каго больш рацыі? Ці чалавек чалавеку ўжо не брат, а вораг?

...Да сваякоў са сталіцы прыязджалі дзеці, унук рваўся ў госці да стрыечнікаў. Дзед з бабуляй не пусцілі, і самі пасля ад'езду гасцей на два тыдні заселі ў ізаляцыю.

Баязлівыя ці проста адказныя?

...Па тэлефоне размова. У пляменніка памёр аднакласнік. Перанёс аперацыю (анкалогія), упэўнена ішоў на папраўку, але гэты вірус...

Пахаванне больш далёкая радня і знаёмыя глядзелі ў запісе, плакалі паасобку, бо не стала дабрэннага хлопца, бацькі траіх дзяцей. Вось ён, сапраўдны твар хваробы. Як яго не баяцца?

Знаёмая (у яе цукровы дыябет і хворае сэрца) на вуліцу выходзіць толькі вечарам, ні з кім не спыняецца, каб пагаварыць, у магазін — калі ўсе на рабоце, толькі ў пальчатках і масцы. Дзеці не едуць, сябрам таксама забараніла...

Ад адзіноты голас як з-пад зямлі.

...Вось з такіх карцінак наша жыццё. Розныя людзі, розныя адносіны да бяды: нехта ўпэўнены, што яго пранясе, нехта з усіх сіл асцерагаецца.

Але жыць у пастаянным страху — таксама не выйсце. Ён стамляе, забірае здароўе. Перад вачыма — прыклад з жыцця маёй мамы. Яе мужа — нашага бацьку — забралі на фронт, а яна, цяжарная, моцна захварэла: тыф тады касіў як касою. Старыя мужчыны (маладыя пайшлі ваяваць) не паспявалі збіваць труны — столькі было памерлых. І дошак на гэта не мелі — не тое што габляваных, нават роўна абрэзаных. Труны збівалі так-сяк, быццам скрыні...

Мама ведала гэта і, захварэўшы, вельмі баялася, што дамавіна ёй дастанецца з дзіркамі — зямля праз іх будзе сыпацца на твар.

Хварэла яна цяжка, кожны дзень, як расказвала, тэмпература — за 40 і пры гэтым у пэўныя гадзіны (іх было па некалькі — раніцай і вечарам) пачынала ляпаць зубамі ад холаду, а потым — трэсціся ўсім целам...

На дактароў не спадзявалася, бо іх — адзінкі, а хворых — у кожнай хаце. Да таго ж вайна — аніякіх лекаў і ніякай амаль што ежы. «Тады каб скрылік сала, то, здаецца, і ажыла б, — успамінала мама. — А ў нас за шчасце бульбіна».

І пры гэтым не было пытання да Бога «за што?»... Як і думак, што выжыве: у перапынках паміж прыступамі хваробы мама проста малілася, каб... труна аказалася без дзірак.

На шчасце, яна не спатрэбілася: на 21-ы дзень хваробы высокая тэмпература нарэшце спала, чарговы прыступ шэхлі (так у нас называлі тыф) не пачаўся.

І зноў мама шчыра малілася, ужо дзякуючы Богу за літасць, а потым — за выздараўленне...

Пасля хваробы яна наноў вучылася хадзіць, у яе павылазілі валасы і аблезла скура... Але дзіця нарадзілася здаровае, калі не лічыць рахіт і проста... неўтаймоўны апетыт.

Сыну (нашаму брату) цяпер 75, ён нарадзіўся вясной 1945-га. Мама з бацькам-франтавіком у згодзе і любові пражылі больш за 50 гадоў, выгадавалі разам дзевяць дзяцей.

І для нас гэта відавочны прыклад: воля божая — каму жыць, а каму паміраць (мамы не стала ў 90).

...Не кажу, што не трэба асцерагацца, не. Але больш, на мой погляд, варта думаць аб тым, каб жыць чалавекам.

**Валянціна Бобрык,**
*г. Івацэвічы.*

**Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.**

# Важней за ўзнагароды

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Міхаілу Ціхановічу з вёскі Дубаўляны Мінскага раёна, калі пачалася вайна, ішоў дваццаць першы год, і ён спраўна нёс армейскую службу. Трывожная вестка напаткала салдата на баявым, як кажуць, пасту. Ад званка да званка — ад ранішняй трывогі 22 чэрвеня 1941 года да пераможнага мая 1945-га, — куды б ні вяла франтавая дарога, баец заставаўся верны баявой прысязе, трывала выносіў усе клопаты і нягоды, годна нёс званне чырвонаармейца.

— Вельмі часта сніцца вайна, мроіцца, што наступаюць немцы, а яшчэ, — быццам паўзу па мінным полі, мацаю зямлю, нешта шукаю, — успамінаў Міхаіл Рыгоравіч Ціхановіч падчас нашай першай і апошняй сустрэчы.

У 1989 годзе, паездзіўшы па гарадах і вёсках краіны, я нарэшце сустрэўся і з адзіным сталічным кавалерам. Міхаіл Рыгоравіч здаўся мне надзіва спакойным і ўважлівым апавядальнікам, паважліва і цярпліва паставіўся да фотасесіі, разумеў, што фатаграфія — мая работа і захапленне. Сустрэча з ветэранам для мяне была быццам узнагарода. А пра ўласныя баявыя ўзнагароды франтавік сказаў: «Мяне пачалі ўзнагароджваць толькі пасля Курскай дугі, а перад гэтым была абарона Адэсы і Севастопаля, дзе мяне моцна параніла. Але я застаўся жыць — і гэта таксама была ўзнагарода!»

За вайну пехацінца параніла ажно пяць разоў. У байца на фронце была цяжкая работа — забяспечваць праходы на мінных палях і хадзіць у разведку.

— Людзі гінулі ў асноўным ад мін, асабліва — неабстраляная моладзь, — дзяліўся сваім горкім досведам былы салдат. — Пасля ранення са шпіталя адпраўлялі ў тыл у запасныя часці, але там было невыносна — кепска кармілі, шмат ганялі і муштравалі, таму яшчэ хворыя салдаты прасіліся на фронт — там было крыху лепей.

Міхаіл Ціхановіч быў на вайне не адзін — яго браты Канстанцін і Мікалай таксама ваявалі, а бацька змагаўся ў партызанах. Лістоў з вайны дадому наш герой не пісаў, бо Беларусь была акупіравана. Затое ў яго быў свой асабісты, падпісаны ўласнай рукой, пасмяротны медальён, які, на шчасце, яму не спатрэбіўся.

З Раманам Кротавым, жыхаром Пружан, я сустрэўся ў сярэдзіне кастрычніка 1988 года ўсё з той жа мэтай — зрабіць партрэт слаўнага абаронца. А разам з тым і паслухаць так званыя «нестатутныя» эпізоды франтавога жыцця. Аднак ні паразмаўляць з кавалерам ордэна, ні зрабіць партрэтную фотасесію мне так і не ўдалося. Аказалася, што Раман Цімафеевіч не любіць здымацца, а з узнагародамі — тым больш. На гэты конт у яго была свая пазіцыя, нават ордэнскіх калодак ён не меў. Мне заставалася здавольвацца адным: здымаць ветэрана як ёсць — перад домам, у звычайнай адзежы.

— Як бачыце, так і здымайце, — паўтараў Раман Цімафеевіч. Я не хачу быць падобным на тых, хто носіць узнагароды напаказ, дзе трэба і не трэба.

Ішоў трэці год перабудовы, грамадства нагадвала парушаны пчаліны вулей. Ветэраны вайны першымі адчулі, што іх забываюць, не ацэньваюць як раней. Такія крыўды чуў я ўжо ад саміх кавалераў. Памятаю такі эпізод і ў размове з інвалідам вайны, поўным кавалерам ордэна Славы Афанасіем Кляцко, і з Сяргеем Сотнікавым, пра якіх мы пісалі ў ранейшых нумарах «Звязды». Зразумела было, чаму не ўсе ветэраны ўспрынялі перамены і тыя павевы, якія несла перабудова. Сваіх крыўдаў не хаваў і Раман Кротаў: «Мы ішлі абараняць Радзіму па поклічы сэрца, не шкадавалі жыцця, пралівалі кроў, а сёння?..»

Жыхар Рагачоўшчыны Раман Цімафеевіч Кротаў, калі пачалася вайна, стаў народным мсціўцам, а потым ваяваў у дзеючай арміі. На жаль, пасля той сустрэчы мне больш не давялося пабачыцца з легендарным салдатам. Ён застаўся ў памяці і на фота сціплым простым чалавекам, якім і быў на самай справе.

**Анатоль КЛЯШЧУК.**



## Міхаіл ЦІХАНОВІЧ

Старшы сяржант Міхаіл Ціхановіч паходзіў з-пад Мінска. У сталіцы жыў родны дзядзька, да якога і перабраўся Міхаіл. Пасля заканчэння сямігодкі юнак пайшоў у школу фабрычна-заводскага навучання, дзе асвоіў спецыяльнасць тынкоўшчыка. Некаторы час ён працаваў на будоўлях у Мінску, а пасля атрымаў павестку з райваенкамата. Было гэта ў кастрычніку 1940-га.

Хлопца накіравалі ў Адэскую ваенную акругу, дзе асвойваў сапёрную справу. Пачатак вайны заспеў яго на тэрыторыі Малдовы. Ён прайшоў праз шмат франтоў — Паўднёвы, Заходні, Варонежскі, Цэнтральны і 1-ы Украінскі. Чатыры разы быў паранены. Удзельнічаў у абароне Адэсы, Севастопаля, у Курскай бітве і шматлікіх наступальных аперацыях. Дарэчы, менавіта пад Курскам ён здабыў першую баявую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі. Група сапёраў пад камандаваннем Міхаіла Ціхановіча зрабіла некалькі праходаў у загароджах праціўніка. Дзякуючы гэтаму пяхота змагла перайсці ў наступ...

Падчас баёў за вызваленне Жытоміра і Кіева яго ўзнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны I ступені. У складзе групы ён спачатку наводзіў наплаўную пераправу, а пасля забяспечваў яе бесперабойную работу. І гэта пад інтэнсіўнымі нямецкімі бамбардзіроўкамі! Падчас адной з атак варожая бомба разарвалася непадалёк ад шчыліны, дзе хаваўся Міхаіл Ціхановіч разам са сваімі саслужыўцамі. Іх кантузіла і засыпала зямлёй, але ніводны не пакінуў поля бою. Спачатку адважнага сапёра прадставілі да ордэна Чырвонага Сцяга, што падтрымлівалі камандзір корпуса і камандзір дывізіі. Але ваенны савет арміі вырашыў крыху панізіць узнагароду.

А вось ордэны Славы былі ў Міхаіла Ціхановіча яшчэ наперадзе. Увесну 1944 года пачалася Праскураўска-Чарнавіцкая наступальная аперацыя. Баі ішлі на Заходняй Украіне. Аднак пасля вызвалення Цярнопаля ў красавіку 1944-га тэмп наступу савецкіх войскаў запаволіўся. Мінула два месяцы, а фронт усё яшчэ стаяў менш чым за 30 кіламетраў на поўнач ад гэтага абласнога цэнтра. І вось малодшы сяржант Ціхановіч атрымаў заданне — разам са сваім аддзяленнем зрабіць праход у мінным полі, каб па ім прайшлі разведчыкі. Варожыя траншэі знаходзіліся вельмі блізка, пастаянна ішлі абстрэлы, але... камандзір групы асабіста «зняў» некалькі дзясяткаў мін. За гэта яго ўзнагародзілі ордэнам Славы III ступені.

А вось больш высокую ўзнагароду сапёр Ціхановіч атрымаў ужо па сукупнасці выкананых заданняў. У кастрычніку 1944-га 60-я армія заняла абарончыя пазіцыі на паўднёвым усходзе сучаснай Польшчы. Старшы сяржант Ціхановіч неаднаразова хадзіў у разведку, а ў ноч на 6 лістапада ён разам са сваёй групай зрабіў праход у загароджванні, каб прапусціць нашых разведчыкаў. Асабіста абясшкодзіў 25 мін.

Шлях да статусу поўнага кавалера ордэна Славы аказаўся зусім няпросты і расцягнуўся амаль на дзесяць гадоў. Было гэта так. У студзені 1945-га яго дывізія працягвала весці баі на поўдні Польшчы. Сапёр Ціхановіч дзейнічаў наперадзе нашай пяхоты і знайшоў нямецкае міннае поле. Узяўся абясшкоджваць боепрыпасы. Немцы пачалі абстрэл, пад якім старшы сяржант зняў прыблізна палову супрацьтанкавых мін. Раптам яго зачапіла варожая куля, але Міхаіл Рыгоравіч не спыніўся і, перавязаўшы рану, працягваў абясшкоджваць міны адну за адной. Дзякуючы гэтаму па дарозе здолела прайсці наша тэхніка. А наш герой яшчэ дапамог параненаму камандзіру ўзвода дабрацца да лазарэта.

Блытаніна ў дакументах прывяла да таго, што старшага сяржанта Ціхановіча паўторна ўзнагародзілі ордэнам Славы II ступені. Толькі ў 1956 годзе яго пераўзнагародзілі ордэнам найвышэйшага статусу.

Пасля вайны ён спачатку доўгі час працаваў у структурах ДТСААФ. Пасля вярнуўся да таго, з чаго і пачынаў калісьці ў даваенны час, — стаў шчыраваць на мінскіх будоўлях.

Памёр ён у верасні 2003 года.



## Раман КРОТАЎ

Герой наступнага аповеду мае незвычайную вайсковую біяграфію. Забягаючы наперад, скажам, што вайну Раман Кротаў скончыў, з'яўляючыся гвардыі казаком. Але казацтва мае, як правіла, паўднёвае паходжанне — згадаць тых жа данскіх, запарожскіх ці кубанскіх казакаў. Здавалася б, што агульнага з імі ў простага беларускага хлопца з глыбінкі? Аднак пра ўсё па парадку.

Раман Кротаў нарадзіўся ў першы дзень 1923 года ў вёсцы Рэкта Рагачоўскага раёна ў звычайнай сялянскай сям'і, скончыў сямігодку, пайшоў працаваць. У 1941-м васямнаццацігадовы юнак шчыраваў тэхнікам-метэаролагам на станцыі ў Клічаве. Калі пачалася вайна, вырашыў вярнуцца да бацькоў.

Але доўга пад акупацыяй Раман заставацца не хацеў і сышоў у лясы. Там ён далучыўся да 10-й Журавіцкай партызанскай брыгады Гомельскага злучэння, дзе хадзіў у разведку. Увосень 1943-га, калі былі вызвалены ад немцаў усходнія раёны Беларусі, брыгада злучылася з часцямі Чырвонай Арміі. Хлопец ваяваў на 1-м Беларускім, пасля на 1-м Украінскім франтах. Ён працягваў весці разведку.

І вось 3 мая 1944 года група разведчыкаў атрымала заданне заняць адну з вышынь у Львоўскай вобласці. Чырвонаармеец Кротаў скарыстаў элемент раптоўнасці — нечакана падняўся ў атаку першы. Ён уварваўся ў варожую траншэю, дзе трапным агнём скасіў некалькі немцаў. Гітлераўская куля, на жаль, не абмінула і яго. Але раненне аказалася не цяжкім, і, пакуль не падаспелі стралковыя падраздзяленні, гвардзеец не пакінуў траншэю. За праяўленыя доблесць і мужнасць камандаванне ўзнагародзіла яго ордэнам Славы III ступені.

Са шпіталя чырвонаармеец Кротаў вярнуўся ў тую ж самую роту. І зусім хутка вызначыўся падчас Львоўска-Сандамірскай наступальнай аперацыі. 15 ліпеня баі ішлі за вялікае сяло Стаянаў на поўнач ад Львова. Герой нашага аповеду дзейнічаў у складзе разведвальнай групы, якая нечакана наткнулася на немцаў. Пачаўся бой. Раман Кротаў знішчыў падчас яго дванаццаць гітлераўцаў. І нават больш за тое — вярнуўся ў савецкае размяшчэнне з добрым «уловам» — палонным немцам і яго ручным кулямётам. Быў паранены і ў гэтым баі, аднак пасля перавязкі працягнуў весці перастрэлку. За ўзорнае выкананне задання быў адзначаны ордэнам Славы II ступені.

Пасля выпіскі са шпіталя чырвонаармеец Кротаў быў адкамандзіраваны ў 11-ю гвардзейскую Данскую казацкую дывізію. У складзе Трэцяга Украінскага фронту ён прайшоў праз Румынію, Венгрыю і Аўстрыю. Прычым самыя жорсткія баі разгарэліся ў Венгрыі, якую гітлераўцы ператварылі ў свой аплот. Там баі ішлі з пераменным поспехам. Яно і зразумела — ужо зусім блізка было да невялічкай анексаванай Аўстрыі, адкуль ужо рукой падаць да мяккага «падбрушша» Германіі — Баварыі. Да таго ж немцы не пакідалі надзеі вярнуць сабе нафтавыя радовішчы Румыніі — без іх танкавыя падраздзяленні маглі спадзявацца толькі на старыя запасы паліва ды на складаны і марудны працэс вытворчасці бензіну з каменнага вугалю.

І вось у адзін з сакавіцкіх дзён гвардыі казак Кротаў атрымаў заданне весці назіранне за пярэднім краем абароны праціўніка на мясцовасці на паўднёвы захад ад Будапешта. Ён своечасова выкрыў, што ў тыле сабралася шмат пяхоты і бранятэхнікі, якія мелі мэтай разгром эскадронаў палка шляхам раптоўнага ўдару. Пра гэта было неадкладна апавешчана камандаванне. І калі немцы перайшлі ў атаку, то мусілі адкаціцца назад з вялікімі стратамі.

Здавалася б, вось ён, поўны кавалер ордэна Славы. Але, як і ў першым выпадку, ваенная мітусня згуляла з 22-гадовым хлопцам дрэнны жарт. Чамусьці яго прадставілі да ордэна Славы III ступені, хоць пазнака пра тое, што ён ужо мае гэтую ўзнагароду, значылася ў дакументах. Памылка была выпраўлена толькі праз 25 гадоў пасля вайны, у 1970-м. Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР пераўзнагародзіў старшыну запасу.

Як склаўся яго лёс у мірны час? Раман Кротаў вярнуўся ў Беларусь і пайшоў вучыцца фінансавай справе. Працаваў спачатку падатковым інспектарам, пасля дайшоў да пасады загадчыка раённага фінансавага аддзела. У 1985-м удзельнічаў у Парадзе Перамогі. Доўгі час жыў у Пружанах, дзе і памёр у 1999 годзе ў сімвалічны дзень 22 чэрвеня...

**Валяр'ян ШКЛЕННІК,**
**Анатоль КЛЯШЧУК *(фота)*.**

---

Праўда жыцця

# СТОЛ З ГІСТОРЫЯЙ

**У фондах Магілёўскага абласнога краязнаўчага музея імя Е. Раманава захоўваецца цікавы рарытэт — стол, інкруставаны фрагментамі каштоўных парод дрэва. Яго аўтар, Якаў Сцяпанавіч Арлоў, быў вядомым майстрам-чырванадрэўшчыкам, меў талент, як той казаў, ад Бога. Стол рабіў да вайны ў падарунак Сталіну і нават не падазраваў, якую трагічную ролю адыграе гэты твор мастацтва для яго сям'і.**

## Нават французы былі ў захапленні

Да вайны шматдзетная сям'я Арловых, дзе выхоўвалася чацвёра дзяцей, жыла ў вёсцы Нядашава Магілёўскага раёна. Гаспадар быў вядомы тым, што вырабляў самабытную прадукцыю: пано, рамкі, шкатулкі, сталы, куфэркі. Мазаічныя работы Якава Сцяпанавіча з розных парод дрэва экспанаваліся і адзначаліся ўзнагародамі на Сусветнай выстаўцы ў Парыжы ў 1937 годзе, на Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ў Маскве. Ён неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Свае работы Арлоў рабіў на заказ партыйных органаў.

Двухтумбавы пісьмовы стол у падарунак Сталіну ён стаў майстраваць да 25-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Выраб быў інкруставаны маленькімі, з палову запалкавага пачка, пласцінамі з каштоўных парод дрэва і нават меў сакрэт: адкрыць яго можна было толькі з дапамогай адной з цэнтральных скрынь. На стальніцы ён зрабіў надпіс: «Вялікаму правадыру Іосіфу Сталіну ад беларускіх сялян». Вайна пачалася да таго, як майстар скончыў сваю работу...

## Гітлеру не аддалі

Якава Арлова даўно ўжо няма ў жывых, з яго першай сям'і засталася адзіная дачка — Лілія Якаўлеўна Піскунова. Калі пачалася вайна, ёй было ўсяго дзевяць гадоў.

Акупанты, даведаўшыся пра ўнікальны стол, вырашылі адправіць яго ў падарунак Гітлеру. І загадалі майстру змяніць былы надпіс на новы — «Вялікаму фюрэру ад беларускага народа». Той не хацеў гэта рабіць, але немцы настойвалі. І тады знайшлі выйсце. Зімовай ноччу ў лютым 43-га партызаны ўзвода разведкі Івана Пархаўчэнкі з 620-га партызанскага атрада імя Васіля Чапаева забралі стол і адвезлі яго на санках у партызанскі атрад. Разам з партызанамі сышоў і Арлоў. Па сям'ю Якава Сцяпанавіча партызаны паабяцалі вярнуцца праз пару дзён. Але не паспелі. Немцы даведаліся пра зніклы стол і забралі сям'ю ў закладнікі. Маці і дзяцей адвезлі ў турму ў Магілёў, паабяцаўшы адпусціць, калі вернецца бацька сямейства.

## Жахлівая цана

Лілія Піскунова ацалела толькі таму, што ёй пашчасціла збегчы з нямецкай турмы. Пасля вайны яна скончыла Магілёўскі педагагічны інстытут і 56 гадоў працавала настаўніцай матэматыкі. Кажуць час лечыць, але, як можна выкрасліць з памяці той жахлівы перыяд жыцця.

— Маці штодня выклікалі на допыты, з якіх яна вярталася са шматлікімі пабоямі, кашляла крывёю, — расказвае жанчына. — Малодшага браціка Валодзю немец забіў на нашых вачах некалькімі ўдарамі бота па галаве. А маці, сястру і яшчэ аднаго брата расстралялі, бо так і не дачакаліся бацькі са сталом для падарунка Гітлеру...

Шмат пакут ёй давялося перажыць пасля ўцёкаў з турмы. Збегчы дапамагла родная цётка. Жанчына падкупіла паліцая і той вывеў дзяўчынку да яе. Цётка хуценька схапіла Лілю на рукі і пабегла. Малую хавалі, яна жыла ў розных сваякоў у Магілёўскім раёне. Увесь час хавалася пад падлогай, таму што была вялікая рызыка быць знойдзенай і расстралянай, разам са сваімі дабрадзеямі.

Навіну пра забойства сям'і Якаў Арлоў успрыняў з цяжкім сэрцам, перажываў гэтую страту: вельмі дарагой цаной абышоўся майстру стол. Пасля вайны ён замяніў надпіс на ім на звычайны арнамент. А ў 1963 годзе, незадоўга да сваёй смерці, перадаў стол у Магілёўскі абласны краязнаўчы музей. Сёння экспанат з трагічнай гісторыяй знаходзіцца ў экспазіцыі, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне.

— Некалькі гадоў таму да нас прыходзіла дачка майстра ад другога шлюбу і расказала невялікую сямейную гісторыю, — гаворыць **загадчыца экспазіцыйна-выставачнага аддзела музея Аляксандра БУРАКОВА.** — Стол быў з сакрэтам, проста так яго не адкрыеш. І бацька гэтым карыстаўся, хаваў ад малой цукеркі.

## Талент у спадчыну

Лілія Якаўлеўна прызнаецца, што яе ўвесь час цікавіла нешта новае, ёй падабалася вучыцца. Яна і шыла, і вышывала, займалася лазой, самастойна асвоіла тэхніку саломапляцення. На пенсіі яна працяглы час вяла гурток па рабоце з саломкай і льном у Семукацкай школе, вучыла дзяцей вырабляць касцюмы з прыроднага матэрыялу. **Педагог-арганізатар Семукацкай ВПК «Дзіцячы сад-сярэдняя школа» Магілёўскага раёна Наталля АЗАРОНАК** успамінае, з якім задавальненнем падлеткі спасцігалі азы гэтага мастацтва. А самым папулярным нумарам на канцэрце падчас сустрэчы выпускнікоў былі дэфіле ў саламяных касцюмах ад Ліліі Піскуновай. Пра іх дагэтуль памятаюць і ў Магілёве, яны праводзіліся ў абласным краязнаўчым музеі і Палацы піянераў (зараз гэта абласны цэнтр творчасці). Работы таленавітай настаўніцы нязменна займалі прызавыя месцы ў конкурсах рознага ўзроўню. Калекцыя касцюмаў Ліліі Піскуновай цяпер захоўваецца ў абласным краязнаўчым музеі. Адна з работ майстрыхі ёсць нават у калекцыі Прэзідэнта Беларусі — была падаравана, калі ён наведваў Магілёўскі раён. Пра яе работы расіяне знялі невялічкі фільм. Лілія Якаўлеўна расказвае, што на «Дажынках» у Бабруйску яе касцюмамі вельмі зацікавіліся расійскія тэлевізійшчыкі. Сёння майстрыха працягвае займацца творчасцю, але ўжо не так актыўна. Разам з мужам Міхаілам Іларыёнавічам перабраліся на лецішча ў Магілёўскі раён і чакаюць, калі ўжо нарэшце скончыцца гэтая пандэмія. Яна не прывыкла сядзець без справы, а абмежаванні перашкаджаюць весці паўнавартаснае жыццё.



**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
**Фота з абласнога краязнаўчага музея.**

На атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь

# КРЫНІЦА ГІСТАРЫЧНАЙ ПАМЯЦІ

**Лаўрэата Прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» калекцыянера старых паштовак Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА добра ведаюць чытачы многіх перыядычных выданняў нашай краіны.**

І не толькі таму, што пра яго часта пішуць, не толькі таму, што журналісты газет і часопісаў часта бяруць у яго інтэрв'ю. Уладзімір Аляксеевіч і сам з'яўляецца аўтарам многіх публікацый, літаральна кожная з якіх суправаджаецца рэпрадукцыямі старых паштовак, старых фотаздымкаў ці іншых ілюстрацый па розных тэмах. І ўсе гэтыя ілюстрацыйныя матэрыялы, усе гэтыя паштоўкі — з уласнай шматтысячнай калекцыі збіральніка гістарычных памятак пра Беларусь і блізкія да нашай Айчыны мясціны. Сваю шматгранную дзейнасць па гістарычнай адукацыі грамадства Уладзімір Ліхадзедаў назваў праектам «У пошуках страчанага». Пад такой рубрыкай друкуюцца матэрыялы ў розных газетах і часопісах. З гэтай пазнакай у некалькіх выдавецтвах выходзіць серыя кніг, філакартычных альбомаў. І выдадзена іх ужо недзе каля трыццаці. Лідарам тут, несумненна, з'яўляецца Выдавецкі дом «Звязда». З назвай «У пошуках страчанага» арганізаваны пастаянна дзеючыя на працягу 15 і болей гадоў экспазіцыі, вандроўныя выстаўкі ў бібліятэках, музеях, школах, ВНУ, праваслаўных храмах, карцінных галерэях. А яшчэ ў Мінску было праведзена некалькі міжнародных канферэнцый, на якія з Масквы, Вільнюса, Санкт-Пецярбурга, Кіева, Адэсы, іншых гарадоў суседніх краін прыязджалі калекцыянеры, гісторыкі, даследчыкі філакартыі.




...ўвабрала ў сябе больш за 400 паштовак, была прэзентавана ў мінскім Доме яўрэйскай культуры. Лаўрэат Ленінскай прэміі, вядомы архітэктар і скульптар Леанід Левін адгукнуўся на яе так: «Гэтае ўнікальнае выданне павінна пачаць сваё падарожжа па краіне, неабходнай здаецца прысутнасць кнігі ў нашых бібліятэках...»

Наступны быў альбом «У пошуках страчанага». На яго старонках паштоўкі, прысвечаныя мясцінам Мінска і шасці абласцей краіны, суправаджаліся кароткімі краязнаўчымі эсэ пра той ці іншы куточак Беларусі.

Такі быў кніжна-філакартычны пачатак. Далей — болей... У 2008 годзе выйшлі альбомы «Мінск. Падарожжа ў часе», «Беларусь вачыма нямецкага салдата. 1915—1918», «Знічкі Айчыны», альбом, прысвечаны выявам, што звязаны з жыццём і творчасцю класіка польскай літаратуры, аўтара «Пана Тадэвуша» Адама Міцкевіча. Дарэчы, міцкевічаўскі альбом паклаў пачатак цікаваму, досыць арыгінальнаму кірунку ў выкарыстанні ілюстрацыйнага матэрыялу дзеля раскрыцця асобы вялікага чалавека, а праз яго — і лёсу нацыянальнай культуры.

Нараджэнне фатаграфіі адносіцца да 1839 года. Фактычна толькі другая палова XIX стагоддзя пашырыла фатаграфічную прастору. І як жа ў такім разе расказаць пра класіка з дапамогай фотаздымкаў і тым болей старых паштовак, нараджэнне якіх увогуле адносіцца да 1869 года? Уладзімір Ліхадзедаў праявіў сябе як вопытны даследчык-рэканструктар. У выпадку з міцкевічаўскай тэмай ён пайшоў наступным шляхам. Асобна згрупаваў паштоўкі, якія ўяўляюць сабой выявы мясцін, звязаных з жыццём паэта. Асобна — паштоўкі, на якіх мы можам убачыць помнікі Адаму Міцкевічу. Таксама вылучаны асобным раздзелам і паштоўкі з надрукаванымі рэпрадукцыямі ілюстрацый да твораў класіка польскай і сусветнай літаратуры.

Што цікава, звяртаючыся да тэмы мемарыялізацыі памяці аўтара «Пана Тадэвуша» і «Дзядоў», Уладзімір Ліхадзедаў падабраў красамоўныя старыя паштоўкі, якія расказваюць пра тую ці іншую мясціну ў розны час. І здаралася, што нейкая падборка старых паштовак выглядае ўнікальным гісторыка-краязнаўчым эсэ — у якім выразна гаворыцца і пра ўсталяванне помніка, і пра яго дэмантаж пры пэўных грамадска-палітычных абставінах, і пра вяртанне праз дзесяцігоддзі. Да месца будзе згадаць, што ў грамадскіх, асветніцкіх ініцыятывах Уладзіміра Аляксеевіча ёсць прыклады, калі ён праз краязнаўчы пошук выяўляў помнікі і пасля вяртаў іх да жыцця. Яны звязаны геаграфічна з Міншчынай і з Берасцейшчынай. Ажыццявіць гэты клопат дапамагалі Уладзіміру Ліхадзедаву і яго нераўнадушным паплечнікам старыя паштоўкі, старыя фотаздымкі.

Але ж вернемся да філакартычных альбомаў беларускага калекцыянера. Праз публікацыю рэпрадукцый у кнігах руплівы збіральнік гістарычнай памяці ўсямерна, шматбакова, досыць рэльефна раскрыў повязі Беларусі з мусульманскім светам, шырока адлюстроўваў фінансава-банкаўскую гісторыю і Беларусі, і ўвогуле Расійскай імперыі. А яшчэ ж з'явіліся на свет кнігі «Палігон», «Місія міласэрнасці», альбомы, звязаныя з імёнамі Юльюша Славацкага, Тадэвуша Касцюшкі, іншыя досыць грунтоўныя філакартычныя выданні. Між іншым, кнігі выдаваліся на васьмі мовах: беларускай, рускай, англійскай, нямецкай, французскай, польскай, арабскай і турэцкай. Некаторыя альбомы з унікальнай філакартычнай бібліятэкі «У пошуках страчанага» ўжо даўно сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. З кнігамі працуюць у школах, у ВНУ — найперш на гістарычных факультэтах. Уважліва разглядаючы старыя паштоўкі, можна ўявіць, якімі некалі былі нашы гарады, мястэчкі, якую вопратку насілі нашы прашчуры, якімі рамёствамі яны займаліся.




І як вынік многіх гадоў напружанай збіральніцкай, гісторыка-асветніцкай, грамадскай дзейнасці ў межах аднаго гісторыка-асветніцкага праекта «У пошуках страчанага» — вылучэнне члена Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміра Аляксеевіча Ліхадзедава на Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь. Фактычна збіральнік паштовак прадстаўлены да яе за сваю літаратурную, літаратурна-краязнаўчую дзейнасць, стварэнне выставак і музейных экспазіцый, захаванне і вяртанне культурна-гістарычнай спадчыны.

Філакартычныя альбомы Уладзіміра Ліхадзедава (пачатак іх выданню пакладзены ў 2007 годзе) уяўляюць сабою, як правіла, раскладзеную па раздзелах публікацыю рэпрадукцый старых паштовак на тую ці іншую актуальную з пункту гледжання асветніцтва, гістарычнага выхавання грамадства тэму. У 2007 годзе была выдадзена кніга «Сінагогі». Праўда, у ёй калекцыянер паказаў сінагогі не толькі Беларусі, але і многіх краін свету. Розгалас выданне мела досыць шырокі. Кніга, якая ўвабрала ў сябе больш за 400 паштовак...

Шмат якія здымкі, выкарыстаныя на старых паштоўках (як, дарэчы, і самі, здавалася б, тыражныя паштоўкі), захаваліся ў адзіным экзэмпляры. А калі ёсць нават некалькі на адну тэму, то не заўсёды яны даступныя з архіваў і запаснікаў музеяў. За філакартычным кнігазборам Уладзіміра Ліхадзедава ўважліва сочаць ва ўсім свеце. Кірыл Сокал, пісьменнік, кандыдат геаграфічных навук, які працуе ў Маскоўскім дзяржаўным універсітэце імя М. В. Ламаносава, так выказаўся пра зробленае беларускім калекцыянерам: «Другой такой аўтарскай бібліятэкі не існуе не толькі ў Беларусі, але і ў Расіі. А можа быць, нават і ў свеце... Выдавецкая дзейнасць калекцыянера ўражвае. Ведаю, што магутны штуршок дзеля падтрымкі Уладзіміра Аляксеевіча Ліхадзедава зрабіла беларуская дзяржава. І што самае важнае — і кнігі, і альбомы, і газетныя і часопісныя публікацыі ўтрымліваюць істотны тэкставы матэрыял. З такімі выданнямі можна смела ісці ў школу, у студэнцкія аўдыторыі. Паштоўка можа і павінна дапамагаць вывучаць гісторыю краіны».

Другі складнік гісторыка-асветніцкага праекта «У пошуках страчанага» — стварэнне выставак і музейных экспазіцый. І гэты кірунак работы краязнаўца, філакартыста проста не можа не ўражваць. За мінулыя 15 гадоў у Беларусі і за яе межамі Уладзімір Ліхадзедаў правёў каля 100 (!) аўтарскіх выставак арыгінальных фотаздымкаў і старых паштовак. Сапраўды, самімі выстаўкамі, стварэннем новых музейных экспазіцый калекцыянер спрыяў і спрыяе развіццю цікавасці да нашай краіны, да гісторыі, да турыстычнага патэнцыялу праз розныя адрасы Беларусі. Толькі ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны Уладзімір Аляксеевіч правёў больш за 20 выставак. Найбольш значныя сярод іх — «У пошуках страчанага» (было прадстаўлена 400 арыгінальных паштовак з відамі гарадоў і мястэчак Беларусі), «1812 год» (з нагоды 200-годдзя Айчыннай вайны), «Беларусь 1915—1918» (з нагоды 90-годдзя заканчэння Першай сусветнай вайны)... У 2014 годзе пры падтрымцы пасольства Рэспублікі Беларусь у Расійскай Федэрацыі ў Маскве прайшла выстаўка «Імгненні Першай сусветнай вайны. Погляд па абодва бакі фронту».

Асобна ў праекце «У пошуках страчанага» вылучаецца тэма ўзнаўлення гісторыка-культурнай спадчыны. У 2014 годзе Уладзімір Ліхадзедаў упершыню прадставіў экспазіцыю «Друкарскі двор». Адбылося гэта ў час правядзення Дня беларускага пісьменства ў Заслаўі. У экспазіцыі калекцыянера з'явіліся дзеючы друкарскі станок і абсталяванне для вытворчасці паперы па тэхналогіях XV—XVII стагоддзяў. З таго часу «Друкарскі двор» пачаў падарожнічаць па Беларусі і Расіі. Госці міжнародных кніжных выставак, фестываляў займелі магчымасць не проста стылізавацца «пад Скарыну» — у ролі «першадрукароў» аддрукаваць старонкі старых кніг. З часам калекцыянер, філакартыст, пісьменнік ідзе далей і ўзнаўляе «Біблію Рускую», аддрукаваўшы кнігу на паперы і па тэхналогіях XVI стагоддзя. Доктар гістарычных навук, вядомы скарыназнаўца Георгій Галенчанка на гэту падзею адгукнуўся так: «...варта разумець, што пры сённяшнім развіцці тэхнікі зрабіць факсімільнае ці рэпрынтнае выданне не дужа і складана, у той час як узноўленая кніга — рэдкасць...»

...Усе здабыткі, усе абсягі, якія выводзяць праект «У пошуках страчанага» на шырокі асветніцкі прасцяг, і пералічыць цяжка. Уладзімір Ліхадзедаў працуе як сапраўдны навукова-практычны цэнтр, як інстытут, дзе галоўныя пазіцыі ў высвятленні гістарычнай памяці займае старая паштоўка. Працуе даследчык, збіральнік не адзін год. І ўжо самім прыкладам паслядоўнай руплівасці на гісторыка-краязнаўчай, калекцыянерскай ніве Уладзімір Ліхадзедаў уражвае, вучыць любіць нашу Радзіму — Беларусь і рабіць усё магчымае для яе росквіту.

**Кастусь ЛАДУЦЬКА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

---

Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

## ЧАМУ НЕ ЦВІТУЦЬ ПІВОНІ?

**Раскошнае цвіценне півонь кожную вясну ўпрыгожвае сады вакол нашы двары і падворкі. Гэтыя кветкі непатрабавальныя і, правільна пасаджаныя, дзясяткі гадоў растуць на адным месцы. Аднак кветкаводы-пачаткоўцы нярэдка скардзяцца на тое, што півоні ў іх не зацвітаюць. Прычын для гэтага можа быць некалькі.**

**Няправільна выбранае месца для пасадкі** — залішне цяністае і вільготнае або паблізу буйных раслін (дрэў, кустоў). У такіх месцах півоні калі і цвітуць, то слаба.

**Кіслая глеба** (для півонь аптымальная кіслотнасць грунту 6,5). Травяністыя півоні не любяць торф. Непажадана яго выкарыстанне нават у выглядзе мульчы, зімовага ўкрыцця, дадання ў пасадачную яму.

**Занадта мелкая або занадта глыбокая пасадка** — змяшчальныя пупышкі, размешчаныя каля пачатку сцёблаў, павінны знаходзіцца не глыбей чым за 3—5 см ад паверхні зямлі. Калі пупышкі заглыбленыя — півоні не зацвітуць. Калі пупышкі амаль не прыкрытыя зямлёй — зімой яны могуць вымерзнуць, і кветак, зноў жа, не будзе.

**Недакорм або перакорм угнаеннямі.** Пры поўнай адсутнасці падкормак півоні цвітуць, але слаба. А вось лішак азоцістых угнаенняў дасць магутныя, высокія кусты з буйнымі лістамі, але без кветак! Азот патрэбен півоні толькі падчас бутанізацыі.

**Недастатковы паліў у засушлівае надвор'е.** Асабліва моцна півоні маюць патрэбу ў вільгаці ў перыяд бутанізацыі, прычым паліў ім трэба багаты: па 3-4 вядры вады на куст! Пры адсутнасці паліву вялікая частка бутонаў, якія ўжо завязаліся, засохне.

**Моцная зрэзка сцёблаў з кветкамі і лісцем** (для букетаў), **а таксама заўчасная абрэзка лісця восенню.** Лісце забяспечвае харчаванне расліны; чым больш лісця на кусце півоні, тым больш закладваецца пупышак аднаўлення для парасткаў будучага года. На зіму ўсю надземную частку расліны зразаюць да ўзроўню зямлі, але рабіць гэта трэба толькі тады, як пасля першых замаразкаў сцёблы півонь палягуць. Да гэтага моманту ідзе адток пажыўных рэчываў з лісця і сцёблаў у карані, і занадта ранняя абрэзка наносіць раслінам вялікую шкоду.

Пажадана не дапускаць ападання пялёсткаў на лісце, бо пры гэтым на лісці адразу ж (у вільготнае надвор'е або ад расы) утвараюцца плямы шэрай гнілі — вельмі небяспечнай хваробы півонь. Калі кветкі страцілі дэкаратыўнасць — адцвілі, — зрэжце іх галоўкі да першага зялёнага лістка і прыбярыце з участка, каб не было гнілі.

Вельмі карысна перыядычна праводзіць прафілактычныя апырскванні півонь супраць шэрай гнілі — двойчы да цвіцення (у перыяд масавага адрастання парасткаў і ў перыяд бутанізацыі) і двойчы пасля цвіцення — супраць плямістасці. Апырскваць лепш хлоракісам медзі (40 г/10 л вады).

**Частыя і нясвоечасовыя перасадкі.** Перасаджваць півоні трэба ў жніўні. Перасаджаныя вясной не зацвітуць у год перасадкі.

**Старэнне кустоў з разбурэннем цэнтральнага кораня.** Куст распадаецца на некалькі слабых парасткаў, якія ўжо не зацвітуць. Іх трэба выкапаць, падзяліць і пасадзіць — тады гады праз два яны падужэюць і зноў пацешаць цвіценнем.



Калі купілі дзялёнку півоні вясной, адразу ў грунт яе лепш не высаджваць! Пасадзіце ў гаршчок і ўкапайце яго на абраным месцы (не забывайце паліваць!). Інакш півоня аслабне, не маючы магчымасці нармальнага атрымання пажыўных рэчываў і выкарыстоўваючы для гэтага запасы з уласнага карэнішча. У жніўні можна выняць расліну з гаршка і пасадзіць у зямлю па ўсіх правілах, бо толькі пры восеньскай пасадцы ў півонь з'яўляюцца дробныя ўсмоктвальныя карэньчыкі.

Каб атрымаць буйныя шапкі кветак, за час бутанізацыі два разы паліце іх водным растворам мачавіны (1:10).

Вельмі адказны перыяд жыцця півонь — месяц-паўтара пасля цвіцення. У гэты час ідзе закладка і развіццё пупышак аднаўлення — тых, якія будуць цвісці на наступны год ці праз два гады. Для пышнага цвіцення півонь у будучым годзе патрэбныя падкормкі калійнымі ўгнаеннямі (сульфат калію, калімагнезія і іншыя). Выдатна рэагуюць яны і на арганічныя падкормкі. З гэтай мэтай многія кветкаводы асцярожна закопваюць неглыбока па перыметры куста бульбяныя шалупіны, размочаныя хлебныя скарынкі і іншыя здробненыя харчовыя адкіды. Можна выкарыстаць і вадкае «зялёнае ўгнаенне» — настой пустазелля.

Калі кусты выраслі досыць вялікія, трэба паставіць падпоркі, а пасля таго як адцвітуць півоні, прыбраць іх.

---

Даты | Падзеі | Людзі

**17 ЧЭРВЕНЯ**

У краіне

**1890** год — нарадзіўся (горад Дуброўна) Фёдар Міхайлавіч Радута, ваенны дзеяч, генерал-маёр. Удзельнік Грамадзянскай вайны 1918—1920 гадоў на Заходнім, Усходнім, Паўднёвым, Каўказскім франтах (начальнік штаба брыгады), савецка-фінляндскай вайны (1939—1940). У Вялікую Айчынную вайну — на Бранскім, Цэнтральным, 1-м Беларускім франтах. Удзельнік Чарнігаўска-Прыпяцкай, Гомельска-Рэчыцкай, Калінкавіцка-Мазырскай, Рагачоўска-Жлобінскай аперацый.



У гэты ж дзень у Мінску адкрыты наноў пабудаваны гарадскі тэатр. З 1920 года ў гэтым будынку працуе Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы.

**1915** год — нарадзіўся (цяперашні горад Ветка) Дзмітрый Міхайлавіч Кавалёў, расійскі паэт, перакладчык. З 1958-га — у Маскве, працаваў у выдавецтве «Молодая гвардия», у Літаратурным інстытуце імя Максіма Горкага. Аўтар зборнікаў паэзіі «Далёкія берагі», «Рабінавыя ночы», «Сцюдзёнае сонца» і іншых. На рускую мову пераклаў асобныя творы Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Івана Мележа і іншых беларускіх аўтараў. Пісаў таксама і для дзяцей.

У свеце

**1885** год — у Нью-Ёрк на борце французскага парахода Isere прыбыў дар французскага народа Злучаным Штатам — статуя Свабоды.

**1920** год — нарадзіўся Франсуа Жакоб, французскі мікрабіёлаг і генетык, лаўрэат Нобелеўскай прэміі па фізіялогіі і медыцыне «за адкрыцці, якія датычацца генетычнага кантролю сінтэзу ферментаў і вірусаў». Член Французскай акадэміі, замежны член Нацыянальнай акадэміі навук ЗША і Лонданскага каралеўскага таварыства.



**1920** год — нарадзіўся Леанід Васілевіч Рашэтнікаў, расійскі паэт. Аўтар зборнікаў вершаў «Паходныя вогнішчы», «Ішла рота з песняй», «Бэз і порах», кнігі апавяданняў і нарысаў «Мерыдыяны мужнасці» і іншых. Лаўрэат прэміі РСФСР імя Максіма Горкага.

**1925** год — прадстаўнікамі 37 дзяржаў падпісаны Жэнеўскі пратакол аб забароне прымянення на вайне ўдушлівых, атрутных або іншых падобных газаў і бактэрыялагічных сродкаў.

**1950** год — чыкагскі хірург Рычард Лоўлер за 45 хвілін выканаў першую аперацыю па перасадцы ныркі чалавеку.

**1955** год — у Савецкім Саюзе здзейсніў выпрабавальны палёт першы ў свеце рэактыўны пасажырскі самалёт ТУ-104.

Так гаварыў...

**ВЕРГІЛІЙ:**
*«Сляпы выпадак мяняе ўсё».*

---

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.37 | 21.44 | 17.07 |
| Віцебск — | 4.18 | 21.43 | 17.25 |
| Магілёў — | 4.27 | 21.35 | 17.08 |
| Гомель — | 4.33 | 21.22 | 16.49 |
| Гродна — | 4.54 | 21.58 | 17.04 |
| Брэст — | 5.04 | 21.49 | 16.45 |

**Месяц**

***Апошняя квадра 13 чэрвеня. Месяц у сузор'і Цяльца.***

**Імяніны**

***Пр.*** *Засіма, Мяфодзія, Мітрафана, Севярына.*
***К.*** *Аліны, Ірмы, Лаўры, Адольфа, Альберта, Ігната, Рыгора.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




---

УСМІХНЕМСЯ

**Чым менш жанчына збіраецца на сябе надзець, тым болей часу ёй на гэта спатрэбіцца.**

Ад жыцця лепш атрымліваць не «радасці скупыя тэлеграмы», а шчодрасці вялікія пераводы.

**Вяселле было ціхае — у рэстаране быў бясплатны Wi-Fi.**





ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі — 287 18 81.

www.zviazda.by
e-mail: info@zviazda.by
для зваротаў: zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004.

220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень. Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1847.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Нумар падпісаны ў 19.30 16 чэрвеня 2020 года.